Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 СТУДЗЕНЯ 2022 г. СУБОТА № 19 (29641)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ЗАЎСЁДЫ САМІ ПРЫМАЛІ РАШЭННІ, ВЫЗНАЧАЛІ ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ. І ТАК БУДЗЕМ РАБІЦЬ ЗАЎСЁДЫ, АБАПІРАЮЧЫСЯ НА НАШЫ ПЕРАКАНАННІ І КАШТОЎНАСЦІ»

Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту заўсёды прыцягвае да сябе вялікую цікавасць і ў нашай краіне, і за яе межамі: як правіла, падчас яго кіраўнік дзяржавы абазначае арыенціры, па якіх Беларусь жыве ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Але Пасланне, якое прагучала ўчора і якое небеспадстаўна назвалі ў сецыве «магутнай прамовай» і «гістарычным Пасланнем», несумненна, выклікала большы інтарэс, чым звычайна. Яно прагучала перад рэферэндумам па новай рэдакцыі Канстытуцыі, калі неабыякавасць да грамадска-палітычнага жыцця праяўляецца ў беларусаў як ніколі. «Трэба паслухаць, што скажа Бацька», — неаднойчы даводзілася чуць на гэтым тыдні ад знаёмых і незнаёмых людзей.

Пасланне сапраўды атрымалася незвычайным. Акрамя парламентарыяў, на яго запрасілі максімальна прадстаўнічую аўдыторыю. Гэта дэпутаты і кіраўнікі, вучоныя і практыкі, урачы і педагогі, рабочыя і аграрыі, ваенныя, медыйныя людзі, прадстаўнікі творчых прафесій, пенсіянеры і моладзь, людзі з усіх куткоў нашай краіны. Такім чынам, па словах Аляксандра Лукашэнкі, была закладзена новая традыцыя, фармат будучых зваротаў Прэзідэнта (калі будзе падтрымана новая Канстытуцыя) — ужо не да парламента, а да Усебеларускага народнага сходу.

Яшчэ адну асаблівасць Прэзідэнт патлумачыў так: «Я хацеў бы надаць новае гучанне гэтаму Пасланню і падтэкстам назваць яго як тры пытанні да беларускага народа. Мы прывыклі да таго, што беларускі народ, абраўшы свайго Прэзідэнта, мае права спытаць з яго, крытыкаваць, як толькі гэта магчыма, крыўдзіцца на яго, у радасці праводзіць час. Але, напэўна, і беларускі Прэзідэнт мае права ў пэўныя перыяды нашай гісторыі, асабліва вострыя перыяды, задаць тры хвалюючыя пытанні свайму народу. Пытанні, якія хвалююць Прэзідэнта і наша грамадства»...

Чытайце, шукайце адказы на гэтыя пытанні. Гэта патрэбна краіне. Гэта патрэбна кожнаму з нас.

Фота БелТА.

«МЫ СПРАВІЛІСЯ ДЗЯКУЮЧЫ АДЗІНСТВУ»

«Папярэдні год быў Годам народнага адзінства. Ён паказаў усяму свету з'яднанасць і стойкасць беларусаў. Што мы можам жыць сваім розумам, даражыць нашымі каштоўнасцямі і разам ствараць новыя. Мы вытрымалі шэраг сур'ёзных выпрабаванняў, перш за ўсё звязаных з каранавірусам, санкцыямі, хвалямі міграцыйнага крызісу. Ужо цяпер зразумела: мы справіліся толькі дзякуючы адзінству.

Сённяшнія ўмовы вымушаюць нас быць яшчэ больш сабранымі і мэтанакіраванымі. Літаральна на маршы выбудоўваць доўгатэрміновыя механізмы захавання міру і бяспекі на беларускай зямлі і ў нашым рэгіёне. Фарміраваць новыя кропкі росту ў эканоміцы, а не толькі адаптавацца да змяненняў, якія адбываюцца.

Знаходзячыся ў добрай форме і ўпэўнена гледзячы ў будучыню, мы падышлі да найважнейшага перыяду нашай сучаснай гісторыі — абнаўлення палітычнай сістэмы, новага ўзроўню ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадства. Усведаміўшы, што адбываецца ў свеце ў 2020-м, 2021 годзе, многія з нашых нават прыхільнікаў страпянуліся і спыніліся. Задаюць пытанне: а навошта? Затым, каб не спыніцца і не ўпасці. Паўтараю: затопчуць. Гуляць трэба на апярэджанне. Працаваць трэба на апярэджанне. І, можа, тое, што сёння здаецца некаму дзіўным, заўтра будзе запозненым».

Няўхільна прытрымліваючыся рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу, мы ўвесь 2021 год старанна і скрупулёзна рыхтавалі праект новай Канстытуцыі, якая ў поўнай меры адпавядае запатрабаванням грамадства. І сёння на ўсенародны рэферэндум вынесены праект абноўленага Асноўнага Закона. Гэта амаль праз 5 гадоў работы над Асноўным Законам. Ён не ў 2020-м, 2021 годзе да нас прыйшоў. Журналісты сёння малайцы, паказалі вытокі фарміравання новых змяненняў у цяперашнюю Канстытуцыю. Яшчэ раз падкрэсліваю: гэта трэба для таго, каб не спазніцца. ***Рэалізоўваючы высокі крэдыт даверу, які народ даў Прэзідэнту, разлічваю на актыўную падтрымку грамадзянамі нашай краіны пазіцыі дзяржавы ў такі адказны момант. Гэта датычыцца не толькі галасавання на рэферэндуме, але і тых дынамічных пераўтварэнняў, якія нам разам спатрэбіцца зрабіць. Усё, што будзе пасля прыняцця новай Канстытуцыі, калі яна будзе прынята, — работы будзе яшчэ больш, чым перад рэферэндумам.*** Творчай работы. Работы найбуйнейшых прававедаў, сацыёлагаў, палітолагаў, журналістаў, усяго народа. Мой заклік — быць гатовымі да напружанай работы, якая дасць магчымасць не толькі захаваць краіну ў жорнах новага перадзелу свету, але і пабудаваць нашу будучыню. І, самае галоўнае, будучыню нашай краіны і нашых дзяцей».

«БЕЛАРУСЬ, ЗНАХОДЗЯЧЫСЯ НА СТЫКУ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ, — У ЭПІЦЭНТРЫ»

«Сёння зразумела нават скептыкам: ранейшая сістэма светаўладкавання адыходзіць у мінулае. Фактычна ўжо сышла. Мы з'яўляемся сведкамі перафарматавання сусветнай палітыкі, эканомікі, культуры.

Паўсюдна крытычна павялічваецца ўзровень агрэсіі. Правакацыйная рыторыка стала нормай. Міратворчыя ініцыятывы кладуцца пад сукно. Буйныя ядзерныя дзяржавы спрабуюць выбудаваць новыя дамоўленасці, разумеючы, што трэцюю сусветную планета наўрад ці зможа перажыць.

Але знайсці кампраміс пакуль не атрымліваецца. Грамадскую думку рыхтуюць да непазбежнасці вайны. Людзей прымушаюць жыць з такой думкай. Па сутнасці, вырашаецца лёс чалавецтва: або новыя дамоўленасці, або далейшая эскалацыя і новая сусветная вайна!

Гэта адбываецца таму, што ў свеце не хапае харчавання, ідзе жорсткая барацьба за рэсурсы, рынкі збыту.

У маштабах планеты падарваны давер адно да аднаго. Рэанімаваны даўнія спрэчкі і супярэчнасці. Памежныя інцыдэнты, лакальныя канфлікты, кібератакі, бітвы вакцын — усё гэта рэалії сённяшняга дня. ***І Беларусь, знаходзячыся на стыку цывілізацый, — у эпіцэнтры гэтых працэсаў.***

На Захадзе ўмацоўваецца ваенная інфраструктура наступальнага характару — ваенныя гэта бачаць. Паблізу граніц Саюзнай дзяржавы размяшчаюцца войскі НАТА, актывізаваны палёты амерыканскіх стратэгічных бамбардзіроўшчыкаў — больш за 30 вылетаў у суткі. У сумежных краінах вядуць размову аб размяшчэнні носьбітаў ядзернай зброі».

«ТАКАЯ ЭСКАЛАЦЫЯ ЎЗДОЎЖ НАШЫХ ГРАНІЦ НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ»

«Нашы заходнія суседзі, Польшча і Літва, актыўна дзейнічаюць у рэчышчы палітыкі Вашынгтона. Для іх гэта стратэгія выжывання. Альтэрнатыва — назаўжды застацца маркотнай ускраінай Еўропы.

Спрабуючы выгадна прадаць свае палітычныя авантуры, літоўцы ідуць уразнос, прытым на шкоду самім сабе. Ва ўгоду Штатам кінулі пальчатку нават вялікаму Кітаю, увязаліся ў супрацьстаянне з Расіяй. Амерыканцам ужо даводзіцца іх стрымліваць.

Але спробы дагадзіць кураторам — на мяжы знішчэння ўласнай дзяржаўнасці.

У гэтых абставінах мы выходзім з таго, што ***з Літвой трэба размаўляць жорстка, але прагматычна, прымушаючы да выканання дагаворных абавязацельстваў, адказваючы на іх дзеянні суразмерна.***

Я проста хачу па-чалавечы сказаць нашым сябрам, нашым блізкім, родным літоўцам: не дай бог вы развяжаце вайну разам з іншымі балтыйскімі дзяржавамі, гэта будзе азначаць канец вашай і дзяржаўнасці, і вашага развіцця. Зноў жа, гэта не пагроза. Гэта папярэджанне. І я гэта папярэджанне адрасую не кіраўніцтву балтыйскіх дзяржаў, а народам.

СТАР. 2–6

ISSN 1990 — 763X

«МЫ ЗАЎСЁДЫ САМІ ПРЫМАЛІ РАШЭННІ,

Польшча здаўна спрабуе рэалізаваць амбіцыі лідарства ва Усходняй Еўропе. Але лідарства разумее не як адказнасць і магчымасць быць сувязным звяном у рэгіёне, а як супрацьборства з Расіяй, у тым ліку праз умяшанне ва ўнутраныя справы яе суседзяў. Дзейнічае безапеляцыйна і бесцырымонна.

Фінансавала і забяспечвала рэсурсамі радыкальную апазіцыю, гадамі стварала каардынацыйныя цэнтры нядаўна праваленага мяцяжу. У надзеі на рэванш прытуліла ў сябе збеглых з Беларусі, фарміруе інфраструктуру для іх падтрымкі...

Але найбольшую асцярогу выклікае нават не гэта. Беспрэцэдэнтная мілітарызацыя дзяржавы, якая праводзіцца Варшавай, нарошчванне ваенных рэсурсаў, запланаванае двухразовае павелічэнне колькасці арміі — усё гэта наўрад ці ў мірных мэтах.

Пазіцыя Беларусі адназначная: такая эскалацыя ўздоўж нашых граніц недапушчальная...

Усё большую трывогу выклікае нарастанне напружанасці на паўднёвым напрамку. ***Украіна становіцца прадметам закулісна га гандлю.*** Украінцаў штурхаюць у полымя канфлікту, ламаюць іх свядомасць, мэтанакіравана рыхтуюць да агрэсіі. Фарміруюць варожае стаўленне да брацкіх народаў, у тым ліку да беларусаў. Для Захаду важна ўтапіць у крыві расійска-ўкраінскае, наша славянскае брацтва.

Але мы — родныя славянскія народы, выхадцы з адзінай купелі хрышчэння. Нашы карані — з глыбіні стагоддзяў. Гэта трэба зберагчы, чаго б яно ні каштавала. Бо брацтва значна вышэйшае, чым надуманыя крыўды і местачковыя палітычныя амбіцыі. Нашы непарыўныя сувязі — аснова агульнай бяспекі і выжывання. ***Мы вернем нашу Украіну ў лона нашага славянства. Мы гэта абавязкова зробім».***

«МЫ ХОЧАМ МІРНА ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ»

«У нашым грамадстве (не з падачы нашай улады і маёй падачы) бытуе пытанне нумар адзін: дык будзе вайна ці не? Мы сабраліся для таго, каб шчыра абмеркаваць праблемы нашай дзяржавы і сумленна і адкрыта адказаць на ўсе пытанні. Дык будзе вайна ці не? Так, яна будзе. Але толькі ў двух выпадках.

Адзін з іх — калі супраць Беларусі будзе ўчынена прамая агрэсія і развязана гарачая вайна. Мы ўсе як адзін і нават тыя, хто не хоча, станем на абарону нашай зямлі і нашай Айчыны. Стагоддзямі наш народ змагаўся за сваю зямлю, незалежнасць і суверэнітэт. Мы дабіліся гэтай незалежнасці. Сёння момант, калі трэба гэту незалежнасць абараніць.

Другая падстава для вайны і ўдзелу ў ёй Беларусі — магчымае нападзенне на саюзніка — Расію. Тады Беларусь падключыцца да абароны Расіі ў рамках саюзных дамоўленасцяў.

Хачу адказаць калектыўнаму Захаду, ці будуць войскі на тэрыторыі Беларусі. Для іх гэта пытанне вельмі важнае. Калі на нашу краіну будзе ўчынена агрэсія, тут будуць сотні тысяч расійскіх войскаў, якія з сотнямі тысяч беларусаў будуць адстойваць гэту свяшчэнную зямлю.

Але беларусы не прымаюць войнаў і ніколі не будуць іх ініцыіраваць. Як чалавек, які ведае цану неймаверна цяжкага жыцця (такіх у зале нямала), хачу сказаць: мы катэгарычна не прымаем вайну. Вайна — гэта вельмі дрэнна, гэта страшна. Жыццё сёння зусім іншае, чым у 1941-м. Тады людзі жылі прасцей, не было таго камфорту, у якім сёння жывём мы. І не дай бог вайна, то самае простае, што нам давядзецца зрабіць — павылазіць з гэтага камфорту і жыць у жудасных умовах, пераносіць увесь цяжар ваеннага часу. Хто гэтага хоча? Ніхто! Ніхто ў свеце гэтага не хоча. Але кіраўнікі некаторых краін, забыўшыся пра гэта, ашалелі наогул. Яны ў гэтай вайне думаюць перамагчы. Перамогі ў гэтай вайне не будзе. Прайграем усе. Таму мы не хочам вайны. Мы наваяваліся. Мы хочам мірна жыць і працаваць».

Беларусь ніколі не стварала праблем сваім суседзям і іншым дзяржавам. І ніколі іх ствараць не будзем. Не толькі таму, што мы мірныя людзі, а таму, што нам гэта проста не трэба. Мы не збіраемся перадзяліць свет. Па-першае, нам гэта не трэба. Па-другое, мы на гэта не здольныя, не валодаем такім рэсурсам».

«ХОЧАШ МІРУ — РЫХТУЙСЯ ДА ВАЙНЫ»

«Ці павінны мы ва ўсёй гэтай сітуацыі рэагаваць і нарошчваць свае абарончыя магчымасці? Адказ відавочны. Хочаш міру — рыхтуйся да вайны...

Але мы не жадаем вайны. Мір — гэта абсалютная каштоўнасць для беларусаў. І для яго захавання нам усім неабходна прыкласці намаганні.

Па-першае, захаваць адзінства грамадства і дзяржавы. ***Краіна здольная эфектыўна супрацьстаяць агрэсіі, толькі калі яна маналітная.*** Як мы ведаем, класічныя войны ўжо не вядуцца. У модзе — гібрыдныя, калі нападу папярэднічаюць распальванне ўнутранага канфлікту, кібератакі, спробы паралізаваць сістэму дзяржаўнага кіравання, дэзарыентаваць грамадства. Менавіта гэтыя стадыі праходзілі перад актамі агрэсіі Югаславія, Ірак, Лівія. Па такім жа сцэнарыі дзейнічаюць і супраць нас. Успомніце, менавіта на піку мяцяжу жніўня 2020 года паўстала пагроза рэальнага ваеннага ўварвання, рэальнай гарачай вайны...

Па-другое, ***неабходна вывесці на якасна новы ўзровень сістэму забеспячэння нацыянальнай бяспекі, асабліва ў сферы абароны.*** Павышаць аснашчанасць воінскіх часцей узбраенне і тэхнікай, навучаць асабовы склад войскаў сучасным метадам і спосабам адбіцця пагроз, развіваць тэрытарыяльную абарону...

Фота БелТА

ДА ВАС, БЕЛАРУСКІ НАРОД, МАЁ ПЕРШАЕ ПЫТАННЕ. АЛЕ НЕ САМАЕ ГАЛОЎНАЕ. ЦІ ГАТОВЫЯ ВЫ, БЕЛАРУСЫ, ПЛАЦІЦЬ ЗА ЎЛАСНУЮ АБАРОНУ, ЗА ЎЛАСНУЮ ДЗЯРЖАВУ? ПАДУМАЙЦЕ НАД ГЭТЫМ.

Наша армія кампактная, манеўраная, баяздольная. Яе моц будзем умацоўваць. Ракетная вытворчасць, стварэнне беспілотнай авіяцыі, стралковай зброі і боепрыпасаў, сучасных сродкаў сувязі і аўтаматызацыі, ваеннай оптыкі і іншай прадукцыі беларускага ваенпрама ўжо пастаўлены на паток... Калі Беларусь не будзе мець і не будзе ўмець вырабляць элементарнае ўзбраенне і боепрыпасы, спадзеючыся на тое, што яго можна будзе недзе купіць ці нехта яго падорыць, гэта нясе вялікую рызыку. Таму пастаўлена задача: вырабляць усё неабходнае для абароны нашай Айчыны, для Узброеных Сіл і тэрытарыяльнай абароны (гэта вельмі важна: каля 300 тысяч чалавек будзе мабілізавана ў войскі тэрытарыяльнай абароны, іх трэба ўзброіць уласнай зброяй і боепрыпасамі). Больш за тое, мы захмахнуліся на самае сучаснае ўзбраенне, у тым ліку ракетнае, у тым ліку з дапамогай нашых саюзнікаў.

Па-трэцяе, ***трэба больш актыўна развіваць узаемадзеянне з Расіяй і іншымі нашымі саюзнікамі па АДКБ.*** Прыклад Казахстана паказаў, наколькі аператыўна АДКБ можа рэагаваць на пагрозы бяспецы на еўразійскай прасторы... Сілы калектыўнай бяспекі сталі ключавым фактарам стабілізацыі абстаноўкі. Новая Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы істотна ўзмоцніць гарантыі міру ў нашым рэгіёне....

Трэба заўсёды памятаць, што мы — міратворцы. Не раз удзельнічалі ва ўрэгуляванні канфліктаў на постсавецкай прасторы, прапаноўвалі ўсе наяўныя рэсурсы, каб звесці за сталом перагаворы Арменію і Азербайджан (памятаеце, мінскі фармат), бакі супрацьстаяння ў канфлікце на ўсходзе Украіны, карпатліва выбудоўвалі архітэктуру пояса добрасуседства.

Беларуская ініцыятыва аб запуску новага перагаворнага працэсу «Хельсінкі-2», у прасоўванне якой было ўкладзена шмат намаганняў, ужо падхоплена еўрапейскімі палітыкамі. Аднак яе аўтарства на Захадзе сарамліва замоўчваецца. Гаспадзь з вамі. Мы вам аддадзім бясплатна гэтую ініцыятыву. Галоўнае, каб яна была рэалізавана.

Мы былі донарам стабільнасці і міру ў рэгіёне. Але ў 2020-м з нас пачалі ляпіць агрэсара. Нашто? Каму гэта трэба было тады і трэба зараз? Захад зрабіў усё, каб Беларусь перастала быць крыніцай міру ў гэтым рэгіёне. Таму нас не трэба папракаць тым, што адбываецца. Вы гэтага хацелі. ***Нягледзячы ні на што, мы будзем настойлівымі і паслядоўнымі на шляху да міру.*** Бо калі разгарыцца канфлікт, ён не зможа застацца лакальным — будзе паласць увесь рэгіён».

«ЧАРГОВАЯ ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ»

«Характэрнай рысай сучасных гібрыдных атак з'яўляецца правакаванне каскаду штучных крызісаў. ***Сітуацыя з мігрантамі каля нашай заходняй граніцы — чарговая праверка на трывалаcць.*** А яшчэ раней больш дробная правакацыя з самалётам, чым яна скончылася — вы ведаеце. Калі глядзець глабальна, так званае вялікае перасяленне народаў — не што іншае, як эфект бумеранга, справакаваны варварскімі дзеяннямі заходніх палітыкаў на Усходзе. Людзі пабеглі ад войн, голаду і разрухі, пачалі шукаць будучыню для сваіх дзяцей. Успомніце зыход бежанцаў у Еўропу ў 2015 годзе. І зараз яны ідуць праз Турцыю, Грэцыю, Італію, Балканы, тонуць у Міжземным моры і Ла-Маншы. Захад даў мільёнам людзей ілжывую надзею, а ў выніку пабудаваў заслон на шляхі ўз'яднання сем'яў. Колькі за гэтым цынізмам на граніцы паламаных лёсаў і чалавечых жыццяў...

Ніякія загароджы не стрымаюць маштабных плыняў мігрантаў, паколькі праблема застаецца не вырашанай у корані. І Беларусь — усяго толькі транзітны пункт у гэтых траекторыях.

Міграцыйны крызіс агаліў нежаданне нашых заходніх суседзяў дамаўляцца, слухаць разумныя довады. І ў сваёй дзёрзкасці яны перасягнулі варварства Сярэднявечча. Іх праслаўлены прыярытэт правоў чалавека аказаўся ўсяго толькі пыхлівай рыторыкай.

Беларусы, наадварот, прадэманстравалі свету сапраўдныя чалавечыя якасці. Далі часовы прытулак на граніцы, накармілі і не далі змерзнуць. Нашы пагранічнікі праявілі вытрымку і не паддаліся на правакацыі. Мы ўсведамляем спецыфіку гібрыднага ўздзеяння і разумеем, што дадзены інцыдэнт не апошні.

Прыклад Беларусі сведчыць аб неабходнасці выбудоўвання прававой і гуманітарнай асновы для вырашэння такіх крызісаў. Гэта трагедыя народаў Усходу, выпрабаванне для заходняга грамадства і яго каштоўнасцяў, хоць бы дэкларацыйных, праверка на чалавечнасць».

«САНКЦЫІ — ГЭТА ІНКВІЗІЦЫЯ НАШАГА ЧАСУ»

«Яшчэ адзін фронт атакі на Беларусь — санкцыі. Не думайце, што гэта выклік толькі для нас. Гэта сусветная тэндэнцыя, трэнд, фактычна тэхналогія глабальнай экспансіі. ***Санкцыі — традыцыйная практыка сусветнага манапаліста: ЗША і іх саюзніка — Еўрапейскага саюза.*** Менавіта такім чынам заўсёды спрабавалі вырашаць пытанні з канкурэнтамі. Так яны змагаюцца супраць Кітая, Расіі, Ірана, Венесуэлы, Сірыі, а зараз і Беларусі. Сёння паўсвету ахоплена іх санкцыямі. Атакуючы нас, спрабуюць выціснуць з рынку нашы флагманы прамысловасці.

Санкцыі пачынаюць выкарыстоўваць як элемент гібрыднай вайны. Па сутнасці, выбудоўваюць алгарытм: санкцыі — унутраны мяцеж — ваеннае ўварванне.

Вынайшлі модны тэрмін «разумныя санкцыі». Нібыта яны ўздзейнічаюць выбарча — толькі на ўладу. Насамрэч Захад метадычна і цынічна намацвае болевыя кропкі эканомікі, праводзіць сапраўдныя антыгуманныя эксперыменты. У канчатковым выніку пакутуюць людзі.

Наша ацэнка такіх дзеянняў катэгарычная. ***Санкцыі — гэта інквізіцыя нашага часу, непрыкрытае парушэнне нормаў міжнароднага права.*** Адпаведная пазіцыя замацавана ў рашэнні беларускага Канстытуцыйнага Суда, і мы будзем з гэтага зыходзіць. ***А тыя так званыя суайчыннікі, якія заклікаюць да санкцый, здзяйсняюць злачынства супраць дзяржавы і ўласнага народа. І яны за гэта адкажуць паводле закона, дзе б ні знаходзіліся.***

Захад дабіўся зваротнага эфекту — рашуча настроіў супраць сябе нашых грамадзян, нават тых, якія верылі ў яго. Маштабныя сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя летась, паказалі, што грамадства не прымае дыктату звонку, рашуча не прымае такія спосабы ўздзеяння. А за ўведзеныя санкцыі супраць Беларусі якраз і выступаюць праславутыя «тры працэнты». ***Людзі ведаюць, што дзяржава заўсёды іх абароніць. Так і будзе.*** Зробім усё, каб просты чалавек не адчуў на сабе негатыўных наступстваў знешняга ціску. Гэта найважнейшая задача, якая пастаўлена перад нашым урадам.

Рэакцыя на санкцыі можа быць толькі адна — мабілізацыя, пошук новых магчымасцяў для развіцця. Іншага не дадзена. І мы гэтыя новыя кропкі выявілі. За кароткі перыяд станаўлення мы змаглі пабудаваць экспартна арыентаваную эканоміку. Няўжо нехта думае, што Беларусь не зможа ў яшчэ большым аб'ёме асвоіць азіяцкія, афрыканскія, паўднёваамерыканскія і іншыя рынкі далёкай дугі? Тым больш таго, што мы выраблялем, у тым ліку харчавання, катастрафічна не хапае ў свеце. Дынаміка тавараабароту з Кітаем і іншымі краінамі гэтых рэгіёнаў — на гэта адказ».

«ПАНДЭМІЯ ВЫРАЗНА ПРАДЭМАНСТРАВАЛА БЕЗАЛЬТЭРНАТЫЎНАСЦЬ МОЦНАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

«Сёння каранавірус стаў з'явай кіраванай, два з лішнім гады таму я вам пра гэта казаў, што такое будзе. У яго з'явіліся свае бенефіцыяры. Мільярдэры ва ўсім свеце значна нарасцілі багацце, прыкметна павялічыўся разрыў паміж вельмі багатымі і астатнім насельніцтвам. Багатыя сталі яшчэ багацейшымі, а бедныя — яшчэ бяднейшымі. На звестках Давоскага форуму, найбольшы прыбытак атрымалі ўласнікі вытворчасцяў IT-індустрыі і фармакалогіі. Цяпер гэта звязаныя бізнесы. Іншымі словамі, загналі ўсіх па дамах, далі гаджэты, падмянілі рэальнасць метасусветам і шпігуюць лекамі. Хіба гэтая мафія адмовіцца ад трыльёнаў свайго прыбытку? Таму і далей нагнятае паніку, а вакцыны становяцца элементам вялікай палітыкі.

На Захадзе разгарнуліся сапраўдныя вакцынныя войны. «Спадарожнік V» не прызнаюць, да «Сінафарм» ставяцца насцярожана, адначасова навязваюць уласны прадукт — «Пфайзер». А па факце дзеляць рынкі і сартуюць людзей.

Пандэмія выразна прадэманстравала безальтэрнатыўнасць моцнай дзяржавы ў барацьбе з крызісам і яго наступствамі. Беларусь не паддалася штучна раздзьмутай масавай істэрыі. Не спыніла эканоміку, не закрыла межы, не паспадзявалася выключна на знешнюю дапамогу.

Нашай перавагай стала эфектыўная сістэма аховы здароўя, якую мы бераглі як зрэнку вока. Вось ён, прыклад таго, што мы, атрымаўшы незалежную краіну, пакінулі ўсё найлепшае з таго, што было. Гэта не мы такія героі, стварылі такую сістэму аховы здароўя. ***Нам хапіла розуму захаваць усё лепшае, што было за савецкім***

ВЫЗНАЧАЛІ ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ...»

часам. У кожным раёне — тую ж невялікую інфекцыйную бальніцу, якая нас сёння ратуе. Мы захавалі выдатную адукацыю ў ахове здароўя. Да нас едуць вучыцца быць урачамі і плацяць за гэта дзясяткі мільёнаў долараў. У нас добрая адукацыя і — як вынік — добрыя ўрачы.

У перыяд пандэміі ў краіне закупілі ўсё неабходнае, мабілізавалі прадпрыемствы на вытворчасць кіслароду, калі яго раптам аказалася недастаткова, і пры гэтым не перапынілі планавага лячэння людзей. На пераадоленне пандэміі і яе наступстваў толькі ў сферы аховы здароўя ўжо патрачана больш як $2 млрд. Больш за два, калі ўзяць усе крыніцы.

Наведваючы «чырвоныя зоны», размаўляючы з урачамі і пацыентамі, я неаднаразова пераконваўся ў высокім прафесіяналізме і дакладных дзеяннях медыкаў. Мы падтрымалі нашых медыкаў, у тым ліку матэрыяльна, і будзем падтрымліваць, як бы гэта ні было дорага...

Сітуацыі з татальнымі лакдаўнамі і кавід-абмежаваннямі паказваюць глыбіню расколу паміж заходнімі элітамі і народам. ***Мы ж навучыліся жыць з пандэміяй без надзвычайных крокаў. З першых дзён мы змаглі адаптавацца да новых умоў і ў максімальна сціснутыя тэрміны знайсці інавацыйныя рашэнні гэтай праблемы без істэрык і мітусні.***

Сёння ўжо Захад і Расія не саромеюцца: слова ў слова паўтараюць тое, што я казаў два гады таму. Што трэба для таго, каб пераадолець COVID? Першае — не павінна быць панікі, і другое — вакцына. Хто толькі нас за гэта ні крытыкаваў, а сёння ўвесь свет ідзе па беларускім шляху. І яны не могуць нам дараваць тое, што сёння самі змушаныя гэты шлях паўтараць, прызнаючы такім чынам нашу правату. Але які цынізм: ***укараняючы ў барацьбе з вірусам беларускі досвед, працягваюць нас за гэты адмысловы шлях лячэння душыць. Гэта адна з прычын ціску на нас.***

Наша рэагаванне на пандэмію каранавіруса выразна паказвае, што мы можам не толькі з годнасцю выходзіць са складанасцяў, але і задаваць новы тон у пераадоленні глабальных праблем. Гэта пацвярджэнне суверэннай палітыкі Беларусі. Мы заўсёды самі прымалі рашэнні, вызначалі шляхі развіцця. І так будзем рабіць заўсёды, абапіраючыся на нашы перакананні і каштоўнасці».

«КРЫНІЦА НАШЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ — ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ»

«Каштоўнасці — гэта код нацыі. Тое, без чаго не будзе нас, беларусаў.

Жыццяздольнасць нацыі напрамую залежыць ад глыбіні і багацця духоўнай спадчыны, якую мы прымножым і перададзім будучым пакаленням. ***Наш арыенцір — не грамадства спажывання, а грамадства адукаваных і свядомых грамадзян, асэнсавана ўцягнутых у стварэнне роднага дома — Беларусі.***

У нашай традыцыі прыярытэт грамадскіх інтарэсаў над асабістымі. Хоць нас доўгі час «апраменьвалі» наймагутнейшым уплывам ідэй індывідуалізму і спажывецтва, гэта робяць і цяпер. У ментальнасці беларусаў — шанаванне старэйшых і павага да дзяржавы. Але нашу моладзь мэтанакіравана падштурхоўваюць да канфлікту пакаленняў, усёдазволенасці і анархіі.

Беларусы разабраліся, што ім трэба. ***Каштоўнасная ўстойлівасць стала асновай для згоды. Нам трэба будаваць дзяржаву, зыходзячы з нашых ментальных традыцый.*** Гэта фарватар дзяржаўнага развіцця. Як толькі адхілімся ад яго, прымерым на сябе чужыя лякалы — звалімся ў бездань...

Мы не заўсёды надавалі значэнне сваім каштоўнасцям, а некаторыя нават лічылі іх архаічнымі, ідэалізавалі чужое. Але ***ў сённяшнім зменлівым і штучным свеце аказалася, што мы са сваім кансерватыўным і традыцыйным мысленнем знаходзімся ў значна больш устойлівай пазіцыі. Галоўнымі слупамі нашага каштоўнаснага падмурка выступаюць імкненне да міру і адзінства, нацыянальна-дзяржаўная ідэнтычнасць, пераемнасць і баланс культур, гарманічнасць этнаканфесійных адносін, шанаванне сям'і як саюза мужчыны і жанчыны.***

Крыніца нашых каштоўнасцяў — гістарычная памяць. У найскладанейшых умовах загартаваліся нашы шматвяковыя духоўна-маральныя арыенціры, сфарміраваўся сапраўдны беларускі характар. ***Сёння мы больш гаворым аб Вялікай Айчыннай вайне, але гэта не азначае забыццё або непрыманне іншых этапаў развіцця нашай дзяржаўнасці.*** На працягу гэтага года мы павінны да гэтага вярнуцца, каб паказаць усім, а асабліва нашым дзецям і моладзі, — хто мы і адкуль, што мы прайшлі і колькі страцілі чалавечых жыццяў, імкнучыся да нашай незалежнасці.

Менавіта таму бягучы год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Ён насычаны знакавымі для Беларусі датамі і юбілеямі, звязанымі з гісторыяй, навукай, культурай. Погляды і версіі, якія насаджаюцца, не павінны закрываць памяць аб мінулым.

Паглядзіце, як скажаецца гісторыя ў найбліжэйшых суседзяў. На вуліцах еўрапейскіх сталіц, вызваленых Чырвонай Арміяй, праходзяць маршы малойчыкаў з фашысцкай свастыкай, нацыстаў ушаноўваюць як герояў, ладзяць паходныя шэсці ў іх гонар, зносяць помнікі савецкім воярам-вызваліцелям. Ці маглі мы ўявіць такое некалькі дзясяткаў гадоў таму?

фота Бел ТА.

Мы працягнем адкрываць старонкі гісторыі Беларусі. Нельга не адзначыць важнасць і актуальнасць ініцыятывы Генеральнай пракуратуры па маштабным расследаванні злачынстваў супраць беларускага народа. Сёння выяўляюцца новыя факты гітлераўскай акупацыі. Гаворка ідзе аб мэтанакіраванай нацысцкай палітыцы генацыду на тэрыторыі Беларускай ССР. Яе крывавы вынік — знішчэнне больш як 3 мільёнаў жыхароў Беларусі.

Вельмі важна, каб сабраны масіў сведчанняў відавочцаў ваенных злачынстваў, вынікаў экспертыз і раскопак не лёг мёртвым грузам на архіўныя паліцы. Нельга дапусціць сцірання злачынстваў фашыстаў і іх памагатых з памяці гісторыі. Гучней за тысячы слоў аб іх злачынствах расказваюць помнік дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Чырвоны Бераг і іншыя гаротныя месцы на нашай зямлі...

Мы будзем дамагацца прызнання і асуджэння генацыду беларускага народа на міжнародным узроўні».

«РАССТАВІЦЬ АКЦЭНТЫ Ў МІНУЛЫМ ДЛЯ АБАРОНЫ БУДУЧЫНІ»

«Надышоў час расставіць акцэнты ў мінулым для абароны будучыні. Мы зрабілі яшчэ адзін крок. Новы статус лёсавызначальнай для нас даты — 17 верасня — стаў актам гістарычнай справядлівасці. Цяпер гэтае свята заслужана стаіць нароўні з Днём Перамогі і Днём Незалежнасці.

І гэта не проста даніна памяці, памяці ўз'яднання нашага народа пасля дзесяцігоддзяў замежнай акупацыі. ***Мы ўвекавечылі сімвал, важны для разумення геапалітычных пагроз, якія і праз сотню гадоў не страчваюць сваёй актуальнасці.***

Мы павінны памятаць, а нашы дзеці павінны ведаць, калі і як перакройваліся беларускія межы, каб дагадзіць чужым нацыянальным інтарэсам, і як гэта — жыць на роднай зямлі, але ў чужой дзяржаве.

Разважаючы над гэтым, вось пра што хачу сказаць. ***Стагоддзямі, намаганнямі многіх пакаленняў, цярністым шляхам — часам цаной жыцця беларусы ішлі да набыцця нацыянальнай дзяржавы. Так, нашаму пакаленню не прыйшлося плаціць за суверэнітэт крывёй. Бог нам дапамог. А сёння мы павінны абараніць незалежнасць. Бо другога шанцу стварыць сваю дзяржаву не будзе.***

Таму ў Год гістарычнай памяці мы зробім так, каб новае дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства — яшчэ мацней загучала фактамі, падзеямі, імёнамі.

Гэта будзе наш адказ дамарослым рэваншыстам, якія мараць разбурыць сістэму, што вось ужо 28 гадоў забяспечвае незалежнасць дзяржавы, цэласнасць нашых граніц і нацыянальнае адзінства».

«НАС НЯСТОМНА СПРАБАВАЛІ ХІСТАЦЬ»

«У жніўні 2020-га была зроблена спроба назаўжды перапыніць эвалюцыю беларускай нацыі, перакрэсліць наша развіццё, адкінуць назад. Да ўлады хацелі прыйсці сквапныя, выключна цынічныя, беспрынцыпныя людзі, прасякнутыя пагардай да Беларусі. Каб у канчатковым выніку растварыць яе, паставіць на калені і падпарадкаваць знешняму ўплыву. Менавіта так, як сёння метадычна знішчаюць Украіну.

Некаторыя эксперты, аналізуючы падзеі жніўня 2020-га, дапускаюць, што да іх маглі прывесці ўнутраныя прычыны — незадаволенасць грамадства, сістэмныя памылкі і таму падобнае. Але давайце маштабуем гістарычную карту і ўважліва зірнём на перыяды да і пасля. Што мы ўбачым?

Доўгі час Беларусь будавала ўласную незалежную палітыку, знаходзячыся ў цэнтры Еўропы. ***Мы былі адкрытыя ва ўсім. І запазычалі ў іх усё, што прымальна для нас. Акрамя адзінага пункта — нашых каштоўнасцяў і ідэалаў. Яны былі і застануцца непарушнымі. Навязваць нам чужы шлях катэгарычна недапушчальна!***

Свабодная і суверэнная Беларусь не ўпісвалася ў планы многіх геастратэгаў на Захадзе. Таму нас нястомна спрабавалі хістаць праз «каляровыя рэвалюцыі» ў 2006, 2010, 2011 гадах... Усе гэтыя нацыскі беларускі народ рашуча адбіваў і станавіўся толькі мацнейшым.

Падрыхтоўка мяцежу 2020 года ажыццяўлялася на парадак больш магутна, з улікам ранейшых няўдач. Мы адназначна расцэньваем падзеі, якія адбыліся, як шматэтапную і скаардынаваную тэхналогію. Рэалізавалася яна адначасова па некалькіх напрамках.

Па-першае, ідэалагічная экспансія. Захад праз розныя адукацыйныя праграмы і семінары спрабаваў навязваць нашым людзям так званыя дэмакратычныя каштоўнасці, абяцаў Беларусі агульнаеўрапейскую ідылію.

Па-другое, фінансаванне. Ужо дакладна вядома: на разбурэнне Беларусі было кінута больш за 6 мільярдаў долараў ЗША. Вельмі хацелася скончыць з намі раз і назаўжды.

Па-трэцяе, інфраструктура. Па ўсёй краіне стваралі сетку спячых ячэек з так званых недзяржаўных арганізацый, асобных СМІ, тэлеграм-каналаў і блогераў. Ва ўмовах «дыктатуры», як нас там любяць называць, падобных антыдзяржаўных структур развялося тысячы. Усе гэтыя нібыта эколагі, праваабаронцы, псеўдажурналісты спрабавалі знішчыць дзяржаву. Пры гэтым нідзе больш не працавалі, жыцця працоўнага чалавека не ведалі. Аднак нядрэнна жылі за кошт заходніх фондаў.

Непасрэдна напярэдадні выбараў перайшлі ўжо да мяккага палітычнага ціску. Успомніце, колькі разнастайных візіцёраў зачасціла да нас перад выбарамі...

Пацярпеўшы няўдачу, Захад перакрэсліў усе дасягнутыя раней дамоўленасці, і падпісаныя пагадненні, і шматлікія абяцанні. У ход пайшлі інфармацыйныя маніпуляцыі, заклікі да гвалту, падрыхтоўка баевікоў і тэрарыстаў, увоз зброі і боепрыпасаў. Ну і, нарэшце, арганізацыя зусім не мірных пратэстаў у жніўні 2020-га, якія ў выніку перараслі ў злачынныя формы самага радыкальнага кшталту...

Але, на шчасце, беларусы, як і ў самыя цяжкія часы гісторыі, праявілі палітычную мудрасць і дальнабачнасць, вызначыўшы свой выбар на стагоддзі».

«ПРАБЛЕМЫ, З ЯКІМІ МЫ СУТЫКНУЛІСЯ, МАЮЦЬ ЯРКА ВЫЯЎЛЕНАЕ ЗНЕШНЯЕ ПАХОДЖАННЕ»

«Мы, вядома, не адмаўляем, у краіне ёсць нейкая доля грамадзян, якія хацелі б іншай формы дзяржаўнага праўлення і ўладкавання, іншай улады. Гэта нармальна: дзяржаўная ўлада не шакалад «Прэзідэнт», каб усім падабацца. Яны, як правіла, заўсёды галасуюць супраць. Ад выбараў да выбараў гэтая частка вар'іруецца ў межах 10 працэнтаў. ***Немалая меншасць, і яе меркаванне мы таксама будзем улічваць. Улічваць і адэкватна рэагаваць.***

Але гэта не датычыцца тых, каму хочацца разгулу бандытызму і анархіі. Давайце на хвіліну ўявім, што магло адбыцца, калі б у выніку так званага пратэснага галасавання да ўлады раптам прыйшлі сёлетнія збеглыя.

У сваёй праграме яны хацелі пад выглядам шырокамаштабнай прыватызацыі і развіцця рынку зямлі правесці рэструктурызацыю, частковую і поўную прыватызацыю вялікіх і сярэдніх прадпрыемстваў, а па сутнасці, кантраляваны распродаж сельгасугоддзяў і флагманаў прамысловасці. Усё было падзелена. Каму і на якіх умовах, мы ўжо цудоўна бачым. Тым, хто іх корміць сёння.

Яны прапаноўвалі далучыць Беларусь да будучай сістэмы паставак звадкаванага газу з ЗША ва Усходнюю Еўропу. Да чаго б гэта прывяло? Паглядзіце на цяперашнія спотавыя кошты на газ. І якая чарга выстраілася сустракаць амерыканскія танкеры. Знайшлося б там месца Беларусі, калі сваім не хапае?

Яны прапаноўвалі «аптымізаваць» колькасць устаноў і супрацоўнікаў у сферы адукацыі і аховы здароўя, скараціць залішнюю колькасць бальнічных ложкаў. У выніку мы б атрымалі параліч усёй сацыяльнай сферы, масавую смяротнасць ад розната роду хвароб.

Яны цягнулі Беларусь у НАТА, прапаноўвалі поўнасцю перайсці на натаўскія стандарты, накіроўваць беларускіх ваенных у адукацыйныя ўстановы і цэнтры краін Альянсу. Гэта прывяло б да вялізных выдаткаў на ўзбраенне і ў канчатковым рахунку — да ракет пад Смаленскам. Вы думаеце, Расія спакойна б на гэта глядзела?

Больш за тое, яны хацелі адмовіцца ад рускай мовы, прысягнуць экстрэмісцкім сімвалам, арганізаваць масавы знос помнікаў. Як вынік — распальванне грамадзянскага супрацьстаяння і разгул нацыяналізму. Адзін з пунктаў — царкоўны раскол па ўзоры ўкраінскай аўтакефаліі.

Відавочна, што людзі не змірыліся б з гэтым і мы атрымалі б бесперапынны канфлікт. Такое маладое грамадства, як наша, проста не перажыло б такога разбуральнага ўдару.

Выкладзеныя факты пацвярджаюць: усё, што мы прайшлі і перажылі, — гэта не спантанныя атакі на ўладу або асабіста Прэзідэнта і не іх эмацыянальны парыў.

Гэта — паслядоўная і мэтанакіраваная палітыка супраць беларускай дзяржаўнасці, нашага народа і яго будучыні. Супраць краіны — заснавальніка ААН, рэгіянальна міратворца, важнага звяна спалучэння Захаду і Усходу. Краіны, якая яшчэ не загаіла раны Вялікай Айчыннай вайны, прыняла на сябе асноўную долю попелу Чарнобыля.

Гэта толькі пацвярджае тое, пра што я неаднаразова казаў раней: ***праблемы, з якімі мы сутыкнуліся, маюць яскрава выяўленае знешняе паходжанне.***

Калі б мы, як некаторыя постсавецкія рэспублікі, паддаліся ліхаманцы змяняльнасці ўлады, дапусцілі шараханні ў палітыцы і ідэалогіі, то некіравальнае пікіраванне было б ужо не спыніць. Нас чакалі б міграцыя, разъяднанасць народа, дысфункцыя эканомікі, рост злачыннасці, страта сацыяльнай дзяржавы — жылі б па прынцыпе: хто можа, той выжывае. І ўсё гэта незваротна, на стагоддзі, калі не назаўжды!»

«МЫ ЗАЎСЁДЫ САМІ ПРЫМАЛІ РАШЭННІ,

«ГРАМАДЗЯНЕ АДЧУЛІ СВАЮ АДКАЗНАСЦЬ ЗА БУДУЧЫНЮ»

«Для захавання краіны, яе незалежнасці і суб'ектнасці, прагрэсіўнага руху наперад дзяржава прапанавала стваральную кансалідацыю ўлады і грамадства.

За мінулы год прынята 22 заканадаўчыя акты, накіраваныя на забеспячэнне нацыянальнай бяспекі нашай краіны. Мы ўзмацнілі прававыя механізмы абароны суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу.

Выдадзены адпаведны Дэкрэт, нормы якога ўключаны ў праект канстытуцыйных змен. Папярэдзілі нарастанне экстрэмізму, навялі парадак на вуліцах. Скарэкціравалі атрыманне і выкарыстанне замежнай бязвыплатнай дапамогі. Удасканалілі падыходы да дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, павысілі адказнасць за паводзіны ў віртуальнай прасторы, прынялі меры па забеспячэнні захаванасці персанальных звестак.

Так, прававое асяроддзе стала больш жорсткім, чым было раней. Але гэтыя новыя правілы знізяць уразлівасць нашага грамадства, створаць платформу для развіцця. Урэшце абароняць людзей ад нестабільнасці.

На аснове рашэнняў шостага Усебеларускага народнага сходу прынята і рэалізоўваецца Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады. За мінулы год выпрацаваны прававыя механізмы, якія даюць магчымасць удасканаліць сістэму адукацыі, падатковае заканадаўства, зямельныя адносіны, жыллёвую сферу, турыстычную галіну, сістэму кіравання дзяржаўнай маёмасцю. Рэалізоўваюцца прагрэсіўныя падыходы да развіцця інавацыйнай сферы, высокатэхналагічнага прадпрымальніцтва ў рэгіёнах. Пашыраны меры падтрымкі шматдзетных і сацыяльна ўразлівых катэгорый грамадзян пры будаўніцтве жылля, у сферы пенсіённага забеспячэння.

Людзі ацанілі нашыя дзеянні. Сацыялагічныя апытанні паказваюць высокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, адзінства і згуртаванасці. Відавочныя падтрымка сацыяльнай палітыкі, адабрэнне інтэграцыйных працэсаў, нашай пазіцыі па сусветных праблемах.

Многія кардынальна перагледзелі свае погляды, зразумелі, што незалежная Беларусь — найвышэйшае дабро і нам нельга яе страціць. Грамадзяне адчулі сваю адказнасць за будучыню, усвядомілі каштоўнасць міру.»

«МАЯ ВАМ ПАРАДА: ДАДОМУ, КАЙЦЕСЯ»

«Многія збеглыя расчараваныя тым жыццём, у якім яны апынуліся. Нават на самым версе. Грошай няма, офісы іх дзеянні фінансаваць не жадаюць, патрабуюць радыкальных мер: заб'яце кагосьці ў Беларусі, пакажаце здымак — заплацім. Яны мусілі гэта разумець. Які б ні быў Зянон Пазняк, ён іх пра гэта папярэджваў. Пачынаецца ўсё з малога, а скончыцца гэтым. Рэакцыя на такія злачынствы будзе самай жорсткай.

Што рабіць? Іх сваякі плачуць: тут у іх засталася ўласнасць. Мы блізка падышлі да вырашэння гэтых пытанняў. А што вы думаеце? Тут у мяне кагосьці будуць забіваць, спальваць, а я буду глядзець на гэта скрозь пальцы? Мы ім пакуль накіравалі сігнал, і яны заварушыліся: як быць, што рабіць? Мая вам парада: дадому, кайцеся і станавіцеся на калені! Далей будзе горш. Таму дадому, на каленях, паўзком!

Калі не можаце самі (твар трэба захаваць, яшчэ чагосьці), вопыт ёсць у літоўцаў і палякаў: няхай яны вас на граніцу падкінуць нам як збеглых, а мы вас забяром.

Дома давядзецца заплаціць штрафныя санкцыі за нанесеную шкоду. «Хоць бы часткова: за тое, што вы нарабілі, не хопіць ні вашай уласнасці, ні ўсяго таго, што вы заробіце наперад за сваё жыццё. Тыя, хто заслужыў гэта па законе, адсядзяць у месцах не аддаленых. Мы створым грамадскую камісію і будзем арыентавацца на рашэнне гэтай камісіі. Туды ўвойдуць прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, нашы парламентарыі — дэпутаты і сенатары. І мы гатовыя вырашаць гэтую праблему. Але прымушаць калектыўны Захад бегаць вакол Лукашэнкі і крычаць: «Палітвязні, палітвязні! Свабоду палітвязням!» — ну і крычыце! Вы ўжо два гады крычыце, які вынік?»

«ПАТРЭБНЫ ІНІЦЫЯТЫВА, УМЕННЕ БРАЦЬ НА СЯБЕ АДКАЗНАСЦЬ»

«Дзеючы Асноўны Закон, па сутнасці, выканаў сваю гістарычную місію. У свой час мы адвялі народ ад прорвы — першая мая праграма, больш я нічога не абяцаў. Тады, у сярэдзіне 1990-х гадоў, народ трэба было адвесці ад прорвы. Мы не толькі адвялі, але і сфарміравалі сваю ўласную дзяржаву. Беларусь навекі заняла, як сказаў паэт, свой «пачэсны пасад між народамі». Цяпер час ісці далей.

Фота Яўгена ПРАСЕЦКАГА.

У новых канстытуцыйных рэаліях імкліва змяняцца належыць і нашай дзяржаве, і грамадскім інстытутам. Час, калі крытэрыем поспеху была адсутнасць правалаў і няўдач, прайшоў беззваротна. Сучасная сістэма кіравання павінна стаць манеўранай, наступальнай, праактыўнай — арыентаванай на апярэджанне і эфектыўнае вырашэнне праблем, якія ўзнікаюць.

Патрэбны ініцыятыва, уменне браць на сябе адказнасць, чуць грамадства. Гэта трэба ўлічваць пры ўдасканаленні сістэмы кадравай палітыкі ў дзяржаве, а тут у нас яшчэ шмат недахопаў. Па-новаму павінны заявіць аб сабе і дэпутаты ўсіх узроўняў, тым больш што іх выбары ўпершыню пройдуць у фармаце адзінага дня галасавання.

Доўгі час мы вывучалі і дэталёва распрацоўвалі пытанне партыйнага будаўніцтва. Мы не станем фарсіраваць гэты працэс, але займацца ім прыйшоў час. Сёння бачныя значныя рэзервы ў здаровых сілах грамадства, якія гатовы генерыраваць і ўвасабляць у жыццё канструктыўныя ідэі. І гэта не толькі найбуйнейшыя грамадскія аб'яднанні: прафсаюзы, «Белая Русь», БРСМ, але і новыя патрыятычныя арганізацыі, канструктыўныя ініцыятывы па ўсёй краіне. Па сутнасці, яны фарміруюць ядро грамадзянскай супольнасці.

У найбліжэйшы час будзе прыняты закон, які вызначыць, што такое грамадзянская супольнасць і што складае яе сутнасць, структуру. Мы дакладна дадзім адказ на гэтае пытанне, каб асноваў грамадзянскай супольнасці не сталі спячыя нацмэнаўскія ячэйкі, якія ў 2020 годзе хацелі перавярнуць краіну. Канструктыўныя грамадскія арганізацыі павінны запоўніць пустэчы ў тых сферах, дзе раней гняздзіліся так званыя замежныя агенты».

«ТРЭБА ВУЧЫЦЦА ЖЫЦЬ ПАВОДЛЕ ЗАКОНА»

«Некаторыя асцерагаюцца, што ў выніку абнаўлення Канстытуцыі і замацавання статусу УНС узнікне нейкае двоеўладдзе. Я нядаўна сказаў, што ***надышоў перыяд, калі нам з вамі трэба навучыцца жыць паводле закона. Калі мы будзем свята выконваць Канстытуцыю і законы, якія прымем у развіццё Канстытуцыі, ніколі ніякага двоеўладдзя не будзе.*** Але ўзаемны кантроль павінен быць (гэта я вам гавару як Прэзідэнт), таму што мы не ведаем (ні я, ні вы), хто будзе наступным прэзідэнтам. Адурманіць народ можна. Цяжка ўжо беларускі народ адурманіць — не дай бог.

Усебеларускі народны сход будзе мець паўнамоцтвы, якія не перасякаюцца з паўнамоцтвамі іншых галін улады. Больш за тое, каб не спарадзіць канфлікт, ва УНС будуць удзельнічаць і дэпутаты, і сенатары, і кіраўнік дзяржавы, і мясцовыя органы ўлады. Мы разам будзем збірацца тут і вызначаць шляхі нашага развіцця. Але калі камусьці захочацца з гэтых шляхоў звярнуць, мы дадзім гэтаму адпор — законна, не на вуліцах. Вось у чым сэнс. УНС — гэта не надуманая форма ўлады, не з космасу ўзятая структура. Гэтае народнае веча ўжо ратавала краіну ў папярэднія гады, навучыла тых, хто хацеў разбурыць дзяржаву, а таму заслужыла канстытуцыйны статус.

Унесеныя ў Канстытуцыю змяненні і дапаўненні адпавядаюць глыбінным запытам грамадства. Гэта таксама пацвярджаюць вынікі сацыялагічных даследаванняў, па якіх аб неабходнасці абнаўлення Асноўнага Закона заяўляе каля 60 працэнтаў грамадзян. Яны лічаць найбольш важным захаванне асноўных сацыяльных гарантый (ахова здароўя, падтрымка пажылых, працоўныя месцы, адукацыя і гэтак далей), гарантаванне бяспекі, пашырэнне рэальных правоў і свабод грамадзян.

Несумненна, у Канстытуцыі павінен быць замацаваны прыярытэт такіх базавых запатрабаванняў і абавязкова будзе замацаваны. Калі мы ад гэтага адмовімся, то перакрэслім усю гісторыю апошняй чвэрці стагоддзя, калі мы стваралі суверэнную, незалежную дзяржаву. Гэта наш здабытак, наша перавага. Адмовіцца ад яго мы не можам. І не адмовімся.

Дынаміка грамадскіх адносін задае новыя стандарты жыцця. Нараўне з базавымі патрэбамі існуюць каштоўнасці найвышэйшага парадку: самарэалізацыя, самапавага, свае месца і голас у свеце. Усё гэта максімальна ўлічана ў праекце, які выносіцца на рэферэндум».

«МІСІЯ МАЛАДЫХ — НАДАЦЬ КРАІНЕ ІМПУЛЬС»

«Асаблівыя чаканні мы звязваем з моладдзю. Важна, каб яна рухала краіну наперад, але пры гэтым абапіралася на вопыт старэйшых пакаленняў і традыцыі. Наша моладзь падзяляе каштоўнасці старэйшых, але жыве ўжо ў іншай сферы — лічбавай. Імкнецца да прагматычных мэт, хуткага прафесійнага росту, гатова інтэнсіўна працаваць і развівацца.

Што патрэбна сучаснаму маладому чалавеку? Як і ва ўсе часы — упэўненасць у заўтрашнім дні, магчымасць атрымаць адукацыю, працаўладкавацца, стварыць сям'ю. Усе інстытуты дзяржавы павінны працаваць на гэта.

Моладзь — гэта не толькі будучыня, але і наша сучаснасць. Маладыя людзі сёння з'яўляюцца непасрэднымі ўдзельнікамі сацыяльнага і палітычнага жыцця краіны. Маладыя людзі павінны разумець, што нішто не ўзнікае з ніадкуль і не даецца проста так. Вынік прыходзіць праз напружаную працу. Лёгкага хлеба не бывае. Чакаем ад моладзі цвёрдасці, дзёрзкасці і самаддачы ў імя агульнага дабрабыту. Мы стварылі дзяржаву, утрымалі яе, прымножылі атрыманую спадчыну. Місія маладых — захаваць яе і надаць краіне імпульс».

«ПАЛІТЫКА КРАІНЫ ПАБУДАВАНА НА ПРОСТЫХ І ЗРАЗУМЕЛЫХ ПРЫНЦЫПАХ»

«Беларусь адбылася як сацыяльная дзяржава. У краіне створаны трывалы, бесперабойны механізм дапамогі і клопату аб людзях, узаемападтрымкі, забеспячэнні сацыяльнай справядлівасці. На гэтым выхоўваецца грамадства.

Палітыка краіны пабудавана на простых і зразумелых прынцыпах. Першы прынцып — справядлівасць. Мы адчулі, наколькі ён важны. Яшчэ тры-чатыры гады таму я сказаў, што попыт на справядлівасць з'явіўся і будзе ўзрастаць. Рэалізацыя гэтага прынцыпу дазволіла забяспечыць збалансаванае размеркаванне сацыяльных даброт, роўны доступ, наколькі гэта магчыма, да іх кожнага беларуса. ***Другі прынцып — адказнасць.*** Дзяржава паслядоўна выконвае абавязацельствы перад грамадствам, гарантуючы ўсебаковую і маштабную падтрымку на працягу жыцця чалавека. ***Трэцім прынцыпам з'яўляецца клопат.*** Выяўляецца ён у шырокай і разгалінаванай сістэме сацыяльнай дапамогі ўразлівым катэгорыям насельніцтва і людзям, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю.

У адпаведнасці з прынцыпамі справядлівасці, адказнасці і клопату ў Беларусі рэалізоўваецца шырокі пакет сацыяльных мер і гарантый. Гэта бясплатныя адукацыя і ахова здароўя, пенсіённае забеспячэнне, падтрымка ўразлівых катэгорый насельніцтва, дапамогі пры нараджэнні і выхаванні дзяцей. Беларусь уваходзіць у 50 найлепшых краін па паказчыках эфектыўнасці нацыянальных сістэм аховы здароўя, апярэджваючы ЗША і Расію. Знаходзіцца ў ліку 25 найлепшых краін у рэйтынгу камфортных умоў для жыцця.

Праграмай сямейнага капіталу з 2015 года скарысталася больш за 107 тысяч шматдзетных сем'яў, а іх колькасць за апошнія 10 гадоў павялічылася ўдвая. Дзяржава бярэ на сябе значную частку расходаў у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі: капітальны рамонт жыллёвага фонду, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, бягучы рамонт дарог, паркаў, сквераў. Субсідзіруюцца выдаткі на праезд у грамадскім транспарце. Напрыклад, па Мінску — у памеры больш за 50 % ад яго поўнага кошту.

У 2022 годзе сацыяльны блок выдаткаў кансалідаванага бюджэту не толькі захаваны, але і істотна прырос, склаўшы амаль палову (каля 50 %) усіх расходаў. Гэта сведчыць аб тым, што дзяржава рэальна клапоціцца аб патрэбах грамадзян. Павышэнне іх дабрабыту застаецца ў ліку прыярытэтаў.

Каля 70 працэнтаў усіх расходаў у ахове здароўя застанецца за дзяржавай, а гэта амаль Br9 млрд. Не менш будзе патрачана на адукацыю — таксама каля Br9 млрд. Каб было больш зразумела: уклад дзяржавы ў бюджэт сям'і за год навучання аднаго дзіцяці ў гарадской школе — Br2,3 тысячы, а ў сельскай, дзе навучэнцаў менш, — Br5,2 тысячы.

Расходы на заработную плату бюджэтнікаў павялічацца амаль на Br2 млрд. Ужо з 1 студзеня павышана базавая стаўка, а дапамога на аздараўленне для работнікаў бюджэтных арганізацый павялічана з паловы да цэлага акладу. Таксама мэтавым чынам прадугледжана Br600 млн на ўстанаўленне новых надбавак. У прыватнасці, настаўнікам — за класнае кіраўніцтва і кураторства. Дадатковыя надбаўкі за работу ў галіне будуць устаноўлены для работнікаў сфер сацабслугоўвання, фізкультуры і спорту, культуры.

Не будуць пакінуты без увагі і тыя, хто ў мінулым заклаў падмурак нашай сучаснасці. Працягнем рэгулярную індэксацыю пенсій і штогадовыя выплаты ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і прыраўнаваным да іх».

«КРАІНУ НЕ ПАБУДАВАЦЬ НА ЎТРЫМАНСТВЕ І АБЫЯКАВАСЦІ»

«Сацыяльная дзяржава, на жаль, мае і адваротны бок: зніжае матывацыю асобных грамадзян да працы і развіцця. Таму часта чуем: калі нешта зроблена дрэнна, вінавата дзяржава, пойдзем да Прэзідэнта. Бо нездарма мы акцэнтавалі ўвагу на праблеме ўтрыманства. Гэтая з'ява для нас катэгарычна

ВЫЗНАЧАЛІ ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ...»

непрымальная. Краіну не пабудаваць на ўтрыманстве (прычым любым — сацыяльным, эканамічным) і абыякавасці. Але да кожнай сітуацыі павінны быць свае падыходы і шляхі вырашэння праблем. Нельга сёння раптоўна адмяніць падтрымку, ільготы і гэтак далей. Гэтага не будзе ніколі, пакуль я Прэзідэнт і вы са мной працуеце. Гэта наша дасягненне, і мы павінны гэта захаваць.

Сёння час адаптыўнай сацыяльнай палітыкі. Падтрымліваючы пенсіянераў і развіваючы пенсійную сістэму, важна не забываць і аб тых, каму трэба ў цяперашнія складаныя часы рухаць краіну наперад, — працоўным авангардзе. Таму патрэбны гнуткасць жыллёвай палітыкі, сістэмы аплаты працы, вызначэнне аптымальных суадносін часу працы і адпачынку.

Асноўны акцэнт сацыяльнай палітыкі будучыні мы бачым у забеспячэнні дэмаграфічнай бяспекі. Патрэбны рашэнні для стварэння маладым мамам больш камфортных умоў, каб сумяшчаць працу і сям'ю, атрыманне адукацыі. Для татаў таксама.

Для павелічэння працягласці жыцця выведзена на новы ўзровень ранняя дыягностыка захворванняў. Вельмі важная праблема, задачы мною пастаўлены і будуць кантралявацца бескампрамісна. Кожнаму беларусу будзе дадзены мінімум адзін вольны ад працы дзень за год для комплекснага амбулаторнага абследавання. Адпаведныя змены ў заканадаўства падрыхтаваны.

У мэтах выяўлення анкалагічных, эндакрынных, сардэчна-сасудзістых і імунных захворванняў будуць укараняцца тэхналогіі штучнага інтэлекту. Дыягнастуем на ранніх стадыях — зможам эфектыўна лячыць. Асабліва анказахворванні».

«КЛАПАЦІЦЦА АБ СВАІМ ЗДАРОЎІ ПАВІНЕН КОЖНЫ»

«Асаблівая ўвага — вытворчасць новых айчынных лекавых прэпаратаў. Шмат перспектыўных распрацовак, як мне дакладваюць, пыляцца на паліцах. Сярод іх і такія, што не маюць сусветных аналагаў.

Ад Міністэрства аховы здароўя і Нацыянальнай акадэміі навук патрабуецца актыўная стратэгія па вывадзе на рынак беларускіх лекаў, вакцын, медыцынскага абсталявання, пастаяннае садзейнічанне распрацоўшчыкам і вытворцам, у тым ліку праз дзяржзаказ. Пазіцыя не павінна зводзіцца да ролі шлагбаума — «прапушчу/забараню». Працуйце на апярэджанне.

Калі вучоны, навуковы калектыў стварылі эфектыўныя прэпараты, метады лячэння, то павінны атрымаць гарантаваны працэнт ад укаранення і рэалізацыі. Нават калі распрацоўка вялася за кошт дзяржаўнага фінансавання, каб зацікавіць здзяйсняць прарыўныя адкрыцці.

Не магу не сказаць аб неабходнасці грамадзян прымаць меры па захаванні і ўмацаванні ўласнага здароўя. Так, ***у нас якасная бясплатная медыцына. Яна такой і застанецца. Але нават самая лепшая медыцына не здольная даць гарантыі. Чалавек сам павінен весці здаровы лад жыцця, правільна харчавацца, своечасова звяртацца да ўрачоў, займацца фізічнай культурай і спортам, нагружацца.***

Мяне здзівіла, калі на апошнім пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі па выніках абмеркавання праекта Асноўнага Закона прагучала прапанова выдаліць артыкул аб клопаце чалавека аб уласным здароўі. Як гэта — выдаліць? Як можна пазбавіць чалавека законна клапаціцца аб сваім здароўі? Кажуць, хвалююцца, што медыцына будзе платная. Яшчэ раз паўтараю: наша медыцына, якая ёсць, яе бясплатны характар выдатна прадэманстраваў сваю сілу. Не было б гэтага, з ковідам змагаліся бы як на Захадзе: пакуль грошы не заплаціш, ніхто лячыць не будзе. Я гэта цудоўна разумею, таму мы ніколі не пойдзем на тое, каб знішчыць бясплатную ахову здароўя. Мы будзем яе ўдасканальваць і развіваць.

Але пры гэтым кожны чалавек павінен клапаціцца аб сваім здароўі, інакш без гэтага пандэмія не завершыцца».

«СПОРТ ХАЙ ЗАСТАЕЦЦА СПОРТАМ»

«Даводзіцца канстатаваць, што спорт высокіх дасягненняў сёння атручаны палітыкай. Байкот будучай Алімпіяды вяртае свет у рэаліі халоднай вайны. Для нас Алімпіяда ў Кітаі, наадварот, — гарантыя таго, што спорт застанецца спортам, а нашы атлеты змогуць змагацца без ціску.

За спартсменаў, якія будуць адстойваць гонар Беларусі, будзе хварэць уся краіна. Выступаючы на спаборніцтвах, кожны з вас павінен разумець, што з вамі — сэрцы ўсіх беларусаў. Сёння як ніколі грамадству патрэбны сапраўдныя героі, патрыёты сваёй роднай зямлі. І вы павінны паказаць вынік, чаго б вам гэта ні каштавала».

«НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ КАШТУЕ ДОРАГА»

«Нашы грамадзяне адзіныя ў імкненні да суверэнітэту і незалежнасці. Але незалежнасць каштуе дорага ў літаральным сэнсе гэтага слова. Гэта абарона і бяспека, уласная фінансавая сістэма, развітыя і эфектыўныя дзяржаўныя інстытуты — усё вельмі дорага. І ў мяне да вас наступнае пытанне:

«ПАВАЖАНЫЯ БЕЛАРУСЫ, ВЫ ГАТОВЫ ПЛАЦІЦЬ ЗА ГЭТУЮ ДАРАГУЮ РЭЧ, ІМЯ ЯКОЙ — СУВЕРЭНІТЭТ І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ?»

Незалежнасць — гэта ўмова для захавання нацыі, магчымасць вызначаць сваю будучыню. І мы гэтае права нікому аддаць не павінны.

Перш чым адказваць, падумайце. Я знайду магчымасць арганізаваць такую форму, каб атрымаць ад вас адказ на гэта пытанне».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«БЕЗ МОЦНАЙ ЭКАНОМІКІ НЕ БУДЗЕ БЕЛАРУСІ ЯК САМАСТОЙНАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

«У нас створаны ўсе магчымасці для таго, каб зрабіць Беларусь краінай, якая дынамічна развіваецца. Сутнасць нашай эканамічнай мадэлі — эвалюцыйныя пераўтварэнні, захаванне разумнага ўзроўню ўдзелу дзяржавы ў вытворчасці тавараў і паслуг, справядлівае размеркаванне даброт.

На VI Усебеларускім народным сходзе народ выказаўся за захаванне такога эканамічнага курса. Мы яго прынялі. Гэты курс забяспечваецца агульнымі намаганнямі і ўкладам кожнага ў эканоміку і бюджэт краіны.

Без моцнай эканомікі не будзе Беларусі як самастойнай дзяржавы. Негатыўныя прыклады іншых краін гэта пацвярджаюць.

Не спраўдзіўся ні адзін са змрочных прагнозаў так званых незалежных экспертаў і міжнародных фінансавых інстытутаў. Мы перасягнулі плановыя паказчыкі 2021 года па ВУП. Лакаматывам выступіла прамысловасць, якую мы не спынілі. Як вынік — небывалы за 10 гадоў тэмп росту вытворчасці (107 працэнтаў). Ажыўленне сусветнай эканомікі спарадзіла вялікі попыт на беларускія тавары, таму што мы не спыніліся. Айчынныя прадпрыемствы выкарысталі такую знешнюю кан'юнктуру, атрымаўшы нядрэнныя фінансавыя вынікі і практычна поўнасцю разгрузіўшы склады. У цэлым атрымана больш як Br16 млрд толькі чыстага прыбытку.

Аналагічная тэндэнцыя і ў АПК: экспарт галіны дасягнуў максімальнага аб'ёму за апошнія 10 гадоў. Мы атрымалі добры прыбытак і ад сельскай гаспадаркі, і ад лесапрадуктаў. Гэтыя дзве галіны, якія працуюць на мясцовай аднаўляльнай сыравіне, забяспечваюць чвэрць знешнегандлёвых паставак. А колькі папрокаў я выслухаў у сувязі з маштабнымі інвестыцыямі ў сельскую гаспадарку, і асабліва ў дрэваапрацоўку. А іншага шляху не было. Гэта наш рэсурс, і мы яго павінны перапрацоўваць.

Сёння ў эканоміцы вытрымліваюцца ўсе тры ключавыя індыкатары збалансаванага росту. Валютны курс стабільны, рост золатавалютных рэзерваў апярэджвае прагнозы, прафіцыт знешняга гандлю максімальны з 2012 года (плюс $4 млрд). Усё гэта дало магчымасць нават ва ўмовах санкцый скараціць знешні дзярждоўг.

Як заканамерны вынік — захавалі стаіоўчую дынаміку рэальных даходаў насельніцтва (102 працэнты), рэальнай зарплаты (амаль 105 працэнтаў). Не ўрэзалі ніводнай сацыяльнай праграмы, пабудавалі на 14 працэнтаў больш жылля з дзяржпадтрымкай. Увогуле, уведзены ў эксплуатацыю 45 тысяч новых кватэр.

Такую дынаміку неабходна забяспечыць, нягледзячы на санкцыі.

Мы многае, калі не ўсё, зможам зрабіць самі. Гэта ўмова захавання нашага суверэнітэту. Патрэбна толькі сістэмная і ўпарадкаваная работа па забеспячэнні эканамічнай самадастатковасці краіны. Найпершая задача — як мага хутчэй адысці ад залежнасці і замяніць беларускімі аналагамі ключавыя кампаненты для рэальнага сектара эканомікі. Я гавару аб імпартазамяшчэнні: ад рухавікоў для БелАЗа, рэдуктараў, гідраўлікі да ковіднай вакцыны і айчынных мікрасхем. Усё гэта ў нас ёсць.

Намечаныя планы па імпартазамяшчэнні з'яўляюцца асновай выжывання большасці галін, дадуць магчымасць адысці ад санкцыйнай уразлівасці. Пытанню імпартазамяшчэння будзе ўдзелена Прэзідэнтам першарадная ўвага ў гэтай пяцігодцы.

Але хачу перасцерагчы: знешнегандлёвы цуд не будзе доўжыцца вечна. Заробленыя на добрай кан'юнктуры грошы мы ні ў якім разе не павінны патраціць толькі на спажыванне. Крытычна важна выкарыстоўваць іх на павышэнне канкурэнтаздольнасці там, дзе мы не дасягнулі сучаснага ўзроўню развіцця. Інвестыцыі — адзіная бяспечная крыніца эканамічнага росту. Бягучы стан спраў лічу недапушчальным. У найкарацейшыя тэрміны трэба запусціць новы інвестыцыйны цыкл».

«ПЕРААДОЛЕННЕ МІЖРЭГІЯНАЛЬНЫХ АДРОЗНЕННЯЎ — ПРЫЯРЫТЭТ ДЗЯРЖПАЛІТЫКІ»

«Сфарміраваны ў рамках праграмы на пяцігодку пералік праектаў павінен быць абавязкова рэалізаваны, асабліва ў рэгіёнах. Менавіта там трэба зрабіць прарыў. Гэтага чакаюць. 30 гадоў асноўныя рэсурсы спажывалі Мінск і буйныя абласныя гарады. ***Мы сур'ёзна завінавацціліся людзям на месцах. Да канца пяцігодкі стандарт якасці жыцця павінен ісці менавіта адтуль — з раённых цэнтраў, маленькіх пасёлкаў, аграгарадкоў.*** Пераадоленне міжрэгіянальных адрозненняў застанецца прыярытэтам дзяржпалітыкі. А для гэтага трэба больш актыўна ствараць стымулы, каб людзі імкнуліся жыць на ўсёй тэрыторыі, а не толькі ў Мінску. Трэба рацыянальна размяркоўваць прадукцыйныя сілы па краіне. Задача мясцовым органам улады і ўраду — у кожным раённым цэнтры павінна быць вытворчасць на 100—150 чалавек, арыентаваная не толькі на ўнутранае спажыванне, але і на экспарт, каб утрымаць там людзей.

Ключавое значэнне ў гэтым напрамку будуць мець канцэпцыя рэгіянальнага развіцця і прынятая ў верасні праграма інавацый. Яна прадугледжвае стварэнне на месцах каля 100 новых вытворчасцяў і рост да $18 млрд экспарту самых высокатэхналагічных тавараў.

У якасці прыкладу можна прывесці Петрыкаўскі ГАК. Гэта штуршок да развіцця амаль усяго Палесся. Людзі там знойдуць работу. Нам патрэбны такія прадпрыемствы і ў іншых раённых цэнтрах.

Вывучыўшы ўсе нюансы за перыяд трылогіі «Малая радзіма», у пяцігадовай праграме мы вызначылі, што адпраўным узроўнем рэгіянальнай палітыкі павінны стаць 11 гарадоў па 80 тысяч чалавек і больш. Гэта будучыя лідары росту. За папярэднія два гады ўжо зроблена нямала, але далёка не ўсё. І ад урада з губернатарамі я чакаю планаў далейшых дзеянняў.

Застаецца на маім асабістым кантролі і задача адыходзіць ад прамысловага будаўніцтва жылля ў сталіцы. Будзем будаваць жыллё далей для нармальнага размяшчэння прадукцыйных сіл. Бо хутка задыхнёмся ад смецця і гару».

«МАСТЫ І ДАРОГІ»

«Неабходна ўлічыць урок з мостам на Нямізе. Тым больш ён не першы. А праверка ж была праведзена ў сакавіку мінулага года. Стан усіх маставых збудаванняў павінен быць на пастаянным кантролі.

Таму асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць рэканструкцыі мастоў. Мы абследавалі масты і ведаем, дзе маставыя пераходы трэба неадкладна мадэрнізаваць. Трэба гэта зрабіць у што б там ні стала.

Мэта — выканаць праграму «Дарогі Беларусі»: адрамантаваць і пабудаваць за пяцігодку не менш як 7 тыс. км мясцовай сеткі і 5 тыс. км рэспубліканскай. Рэспубліканскія і іншыя значныя дарогі больш-менш прыведзены ў парадак, іх стан трэба толькі падтрымліваць. Цяпер усе сілы кінуты на мясцовыя дарогі. Людзі скардзяцца, што мясцовыя дарогі ў дрэнным стане, асабліва ад абласных цэнтраў да раёнаў і ад раёнаў да аграгарадкоў. Гэтую задачу неабходна мэтанакіравана і метадычна вырашаць.

Пакуль тэмпы нядрэнныя. У мінулым годзе выкананы рэканструкцыя і рамонт на 750 км рэспубліканскіх дарог і больш як 1300 км мясцовых. Уведзены ў эксплуатацыю ўчасткі аўтамабільных дарог да горада Смалявічы, частка трасы Мінск — Мікашэвічы. Адрамантавана 46 дарожных збудаванняў на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах. Вядуцца будаўніцтва паўднёва-заходняга абходу Магілёва, рэканструкцыя моста праз Заходнюю Дзвіну на пад'ездзе да Наваполацка і яшчэ 13 буйных маставых збудаванняў.

Неабходна звярнуць увагу і на тое, што паблізу дарог трэба ствараць рабочыя месцы — запраўкі, рэстараны, кафэ, майстэрні, гасцініцы. Калі патрэбны адзін сістэмны дакумент на маім узроўні, уносьце яго, каб было адно рашэнне і людзі больш не хадзілі па дазволы».

«НЕ ЗНІЖАЦЬ УВАГІ ДА АГРАГАРАДКОЎ»

«Неапраўдана зніжана ўвага мясцовых улад да аграгарадкоў. Разам з тым дзякуючы каласальнай рабоце ідэя іх стварэння матэрыялізавалася амаль у 1,5 тыс. населеных пунктах, у сельскай мясцовасці створаны якасна новыя ўмовы жыцця. Прыгожыя катэджы на месцы струхлелых дамоў, дагледжаныя падворкі, заасфальтаваныя вуліцы, газ, водазабеспячэнне і іншая неабходная інфраструктура сталі прыцягваць тысячы людзей, якія гатовы працаваць на зямлі, ствараць сем'і, гадаваць дзяцей. Упэўнены: развіццё аграгарадкоў і перспектыўных сельскіх населеных пунктаў павінна прадаўжацца. Кірунак

«МЫ ЗАЎСЁДЫ САМІ ПРЫМАЛІ РАШЭННІ, ВЫЗНАЧАЛІ ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ...»

дакладна вызначаны: у далейшым пабудова «вёсак будучыні» будзе праходзіць па прыкладзе Копысі Аршанскага раёна.

Неабходна выкарыстоўваць энергію людзей, захопленых ідэяй развіцця сваёй малой радзімы да стандарту невялікіх гарадоў. Напрыклад, у аграгарадку Ціхінічы ў Гомельскай вобласці мадэрнізавана і вытворчая база, і сацыяльная інфраструктура. Тут не ставіцца пад сумненне прывабнасць сельскага ладу жыцця і працы.

Ураду, мясцовым органам улады трэба больш сістэмна падыходзіць да гэтай работы, а не зводзіць намечаныя мерапрыемствы пераважна да добраўпарадкавання і малазначных рамонтаў. Выпрацуйце адзіныя крытэрыі да вызначэння «вёскі будучыні» і канкрэтныя меры, якія дадуць магчымасць дасягнуць стратэгічнай мэты.

Сяло заўсёды будзе ў фокусе ўвагі і падтрымкі дзяржавы: беларуская аграрная палітыка і ў далейшым будзе зыходзіць з таго, што сельская гаспадарка з'яўляецца шматфункцыянальнай сістэмай, якая забяспечвае не толькі харчовую бяспеку, але і асваенне тэрыторыі краіны, захаванне самабытнай сельскай культуры, далучэнне да працы моладзі.

У перспектыве — стварэнне буйных аграпрамысловых комплексаў (па прыкладзе Віцебскай вобласці), а таксама аб'яднанняў, якія будуць забяспечваць поўны цыкл — вытворчасць і яго ўласнае забеспячэнне, перапрацоўку, рэалізацыю прадукцыі. Гэта паўплывае і на развіццё тэрыторый.

Таксама ў далейшым неабходна падтрымліваць практыку стварэння аграрных карпарацый. Але як інструмент развіцця, а не адтэрміноўкі даўгоў і аднясення вырашэння праблем на потым. Аднак кампанейшчыны быць не павінна. Не кожнаму прадпрыемству падыдзе ўніверсальнае лякала. Напрыклад, невялікі СВК «Ларынаўка» Аршанскага раёна (усяго 2651 га сельгасугоддзяў) вызначыў сваю стратэгію і дэманструе эфект работы на кантрактнай аснове. За мінулы год надой на карову тут склаў 12 т, ураджайнасць збожжавых — 75 ц/га. Сярэднямесячная зарплата — больш за Br2 тыс. Гэта — узровень сталіцы. Невялікае прадпрыемства, няхай жыве і развіваецца.

Пасля заканчэння рэалізацыі праграмы адраджэння і развіцця вёскі прайшло больш як 10 гадоў. Тады мы талакой мадэрнізавалі не толькі вытворчую, але і сацыяльную інфраструктуру. Аднак час ідзе, умовы мяняюцца. ***Патрэбны свежыя рашэнні.***

Для ахвотных будаваць прыватнае жыллё ў вёсцы створаны адпаведныя ўмовы. На 75 працэнтаў тэрыторыі краіны атрымаць участак не з'яўляецца праблемай. Кадастравы кошт зямлі там ніжэйшы за Br100 за сотку. Вызначаны амаль 22 тысячы свабодных участкаў, якія можна набыць хоць сёння. Пры гэтым трэба адзначыць вялізны патэнцыял у старых пустых хутарах і вёсачках, землі якіх можна атрымаць практычна бясплатна. Аднак у гэтым напрамку пакуль не відаць работы райвыканкамаў і асабліва сельвыканкамаў. Асаблівы кантроль.

Сюды прыязджаюць людзі з Расіі, Украіны, заходніх краін, каб жыць на гэтых участках. Між тым беларусы не дастаткова актыўныя ў гэтым плане. Да паўгектара можна ў вёсцы атрымаць. Не сабе, дык дзецям застанецца.

Мы прынялі самыя радыкальныя рашэнні па зносе старых і закінутых дамоў у вёсках. Яшчэ раз — асаблівы кантроль.

Пры гэтым землі сельгаспрызначэння і лясного фонду недатыкальныя. Гэта ўласнасць і галоўны здабытак народа».

«ЧАС РАСПРАНАЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ!»

«ТРЭЦЯЕ ПЫТАННЕ — ЦІ ГАТОВЫЯ ВЫ БЫЦЬ ІНІЦЫЯТЫЎНЫМІ І ПРАЦАВАЦЬ НА СЯБЕ?»

«Ці гатовы беларусы сёння адарвацца пасапраўднаму, адвязацца, паставіць перад сабой, перад сваёй сям'ёй задачу і папрацаваць хоць бы на сябе. А ўсё астатняе, што ад дзяржавы, мы захаваем. І як толькі гэты ўнутраны патэнцыял нашага народа, кожнага беларуса задзейнічаем, мы ў два разы будзем багацейшымі. Час распранацца і працаваць!

У Беларусі была, ёсць і будзе рыначная эканоміка з разумным удзелам дзяржавы ў тых сферах, дзе без яе не абысціся. Работа прадпрыемстваў-манапалістаў, кантроль за цэнамі, агульнай інфляцыяй, будаўніцтва інфраструктуры, медыцына, адукацыя, навука і гэтак далей».

«СУПРАЦЬ НЕАБГРУНТАВАНАЙ ІНФЛЯЦЫІ МЫ ПАВІННЫ ЗНАХОДЗІЦЬ РЫЧАГІ І ДЗЕЙНІЧАЦЬ»

«Жадаю закрануць галоўную праблему, аб якой гаворыць насельніцтва, — рост цэн. Нядаўна прызначаны новы міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю. ***Усяму сацыяльнаму блоку і прэм'ер-міністру даручана прыняць катэгарычныя меры па недапушчэнні неабгрунтаванага росту цэн.*** Дзейнічайце, з вас будзе самае жорсткае патрабаванне. Некалі я даручыў дэпутатам, прафсаюзам, нашым народным кантралёрам інфармаваць нас своечасова. Ураду трэба належна арганізаваць гэтую работу. ***Любая скарга на цэны — я буду прымаць адпаведныя меры.***

Рост цэн звязаны са знешнімі фактарамі, у тым ліку з лакдаўнам і прыпынкам вытворчасцяў у многіх краінах з-за пандэміі. Інфляцыя ў сусветнай эканоміцы стала нарастаць. Мы можам спыніць гэта? Не. Але ***супрацьнеабгрунтаванай інфляцыі мы мусім знаходзіць рычагі і дзейнічаць.***

Хуткасць змен у свеце каласальная. У такіх умовах ад кожнага з нас неабходны максімальная канцэнтрацыя намаганняў, старанасць і дысцыпліна. Патэнцыял узгодненай працы трэба мабілізаваць неадкладна, асабліва ў эканамічнай сферы.

Эканоміка — справа не толькі ўрада, Нацбанка і мясцовых улад. Праваахоўная сістэма таксама завязана на рэалізацыі гаспадарчых задач. ***Трэба спыніць усялякія непатрэбныя праверкі. Не перашкаджайце людзям працаваць, але з каго трэба спытаць, спытаеце.*** Пытанні карупцыі ніхто не здымаў.

Непахісным пастулатам павінна быць справядлівасць правасуддзя. Патрабую, каб следства вялося максімальна адказна, падазраваныя ў эканамічных злачынствах браліся пад варту толькі ў выключных выпадках».

«МЫ ЛІТАРАЛЬНА РАЗУМЕЕМ АДЗІН АДНАГО З ПАЎСЛОВА»

«Партнёр нумар адзін для нас — Расія, з якой паслядоўна рухаемся па шляху эканамічнай інтэграцыі. Практычна палову нашых тавараў экспартуем у гэтую краіну. Мы развіваем супрацоўніцтва як на двухбаковай аснове ў рамках Саюзнай дзяржавы, так і ў складзе інтэграцыйных аб'яднанняў: Еўразійскага эканамічнага саюза, Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Для Беларусі асабліва важна развіваць узаемадзеянне з Расіяй у энергетыцы. У мінулым годзе сумесна пабудавалі і ўвялі ў дзеянне першую Беларускую атамную электрастанцыю, якая з'яўляецца гарантам энергетычнай бяспекі нашай краіны. І пасля выхаду на праектныя магутнасці будзе вырабляць 50 працэнтаў электрычнай энергіі. На пяць мільярдаў кубоў менш будзем закупляць прыроднага газу для вытворчасці электраэнергіі.

Для параўнання: ва Украіне 50 працэнтаў электраэнергіі таксама атрымлівалі на 15 атамных энергаблоках, пабудаваных у савецкія часы. Больш за тое, на фоне газавага крызісу прагрэсіўная Еўропа рэзка разгортваецца ў бок мірнага атама, аб'яўляе аб інвестыцыях 500 мільярдаў еўра да 2050 года ў новую праграму ядзернай энергетыкі. А памятаеце, нашы мярзотнікі бегалі, хацелі быць прэзідэнтамі, крычалі: «Атамную станцыю закрыем!» І ўсе крычалі, што 10 мільярдаў Еўропа нам дасць, а мы гэтую атамную станцыю закрыем. І тады я сказаў: «Не, мы яшчэ і другую атамную станцыю пабудуем». А сёння ўсе хочуць пабудаваць: і Польшча, якая Літву падтрымлівала, хоча чатыры энергаблокі пабудаваць, і нават тая ж Літва сёння думае аб тым, каб пабудаваць атамную станцыю. Толькі галаву не трэба губляць і не трэба згортваць супрацоўніцтва са сваімі суседзямі, каб зарабіць грошы на гэтую атамную станцыю. Гэта значыць, мы правільна тады паступілі.

У знешнегандлёвым абароце Расіі Беларусь займае 4-е месца. У кааперацыйных сувязях задзейнічана каля 7 млн расіян, а з сем'ямі — больш за 15 млн чалавек.

Але не толькі і не столькі эканоміка фарміруе брацкія адносіны. Яны значна багацейшыя, шматграннейшыя, ярчэйшыя. Першаасновай адзінства нашага лёсу выступаюць крэўныя сувязі, культурная спадчына, гістарычная памяць. Мы не проста размаўляем на адной мове, мы літаральна разумеем адно аднаго з паўслова. Гэта вынік тысячагадовай гісторыі нашых народаў. Навошта ж гэта ўсё губляць?

І не трэба сёння папракаць Расію, што яна хоча паглынуць Беларусь. Няма такіх мэт. Беларусь і Расія, будучы незалежнымі дзяржавамі, здольныя выбудаваць такую сістэму супрацоўніцтва, што ёй пазайздросціць любое аб'яднанне.

У канцы 2021 года Беларусь і Расія зацвердзілі 28 саюзных праграм, асноўная мэта якіх — стварэнне новых вытворчасцяў і кампетэнцый у ключавых сектарах, прамысловая кааперацыя нашых краін з фарміраваннем устойлівага ядра базавых тэхналагічных ланцужкоў... Паводле самых сціплых ацэнак, прырост ВУП Беларусі толькі за кошт інтэграцыі з Расіяй складзе больш за два працэнты».

«НАША ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У ВЫБУДОЎВАННІ НАРМАЛЬНЫХ ДОБРАСУСЕДСКІХ, УЗАЕМАВЫГАДНЫХ АДНОСІН»

«Адносіны з Расіяй закладваюць стандарты для работы з дзяржавамі — членамі ЕАЭС і СНД. Беларусь таксама нацэлена на захаванне і пашырэнне існуючых цесных гандлёва-эканамічных і гуманітарных сувязяў з постсавецкімі рэспублікамі...

Раней ураду і МЗС даручалася пераглядзець прыярытэты Беларусі на карысць тых рэгіёнаў свету, якія маюць вялікі патэнцыял і ўзаемную цікавасць. ***Найважнейшым фактарам супрацоўніцтва ў Азіі для нас з'яўляецца сяброўства з Кітаем.*** У студзені адзначылі знакавую вяху на гэтым шляху — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. У канцы мінулага года мной была прынята Дырэктыва па паглыбленні стратэгічнага супрацоўніцтва з Кітаем па шырокім спектры напрамкаў. Плануецца рэалізацыя некалькіх дзясяткаў канкрэтных праектаў у сферах палітыкі, эканомікі, адукацыі, навукі і тэхналогій.

Кітай стаў адным з найважнейшых гандлёвых і інвестыцыйных партнёраў Беларусі. Назаву толькі некаторыя параметры: гадавы абарот ужо перавышае $5,5 млрд, рэалізаваны 23 інвестпраекты на мільярды долараў. Да 2025 года мы плануем экспартаваць у Кітай беларускія тавары на суму да $3 млрд.

Будзе развівацца і галоўны беларуска-кітайскі праект — індустрыяльны парк «Вялікі камень». Нягледзячы на ўсе складанасці 2021 года, у парк прыйшлі 20 рэзідэнтаў з шасці краін. Аб'ём інвестыцый склаў мільёны долараў. Частка вытворчасцяў фарміруюць абсалютна новыя кампетэнцыі і магчымасці для Беларусі.

Беларусь таксама накіравана на ўмацаванне палітычных і эканамічных сувязяў у адносінах з іншымі дзяржавамі Азіі: Індыяй, Пакістанам, В'етнамам. Плануецца актывізаваць работу з Інданезіяй, Малайзіяй, Тайландам. І што, гэтыя санкцыі нас спыняць? Ды нам няшмат трэба прадаць на экспарт. А мільярды людзей жывуць у гэтых краінах. Наша прадукцыя там карыстаецца попытам. Толькі не трэба спыняцца, трэба працаваць над вялікім аб'ёмам гэтай прадукцыі і, галоўнае, якасцю.

Акрамя таго, развіваюцца адносіны з краінамі Блізкага Усходу, афрыканскімі дзяржавамі, Лацінскай Амерыкай з акцэнтам на эфектыўную эканамічную дыпламатыю. Зацікаўлены ў развіцці ўсебаковага супрацоўніцтва з Турцыяй як найважнейшым рэгіянальным цэнтрам сілы. Трэба аддаць належнае, Турцыя, член НАТА, паводзіць сябе прыстойна. Тое, што абяцаюць, выконваюць.

Зразумела, захоўваецца наша зацікаўленасць у наладжванні нармальных добрасуседскіх, узаемавыгадных адносін з Захадам. Беларусь заўсёды разумела важнасць канструктыўнага дыялогу і супрацоўніцтва са Злучанымі Штатамі Амерыкі і краінамі Еўропы для забеспячэння ўстойлівага эканамічнага развіцця, дабрабыту грамадзян, стабільнасці і бяспекі ў нашым рэгіёне і свеце ў цэлым.

Не Беларусь выступіла ініцыятарам абвастрэнняў. І сёння застаёмся верныя сваім перакананням, гатовы вярнуцца да мірнага стваральнага ўзаемадзеяння. Але ў гэтай партыі мяч на іх баку.

Сёння да мяне паступае шмат сігналаў з Польшчы, Літвы, Злучаных Штатаў Амерыкі: «Давайце аднаўляць адносіны. Але нам трэба захаваць твар». Адказ адзін: «Давайце. Мы дапаможам вам захаваць твар»...

Беларусь гатова супрацоўнічаць з Захадам, але толькі калі ён сам хоча развіваць адносіны, не парушаючы яе суверэнітэт і не прымушаючы выбіраць паміж ім і Расіяй. Заўсёды з Расіяй, таму што ў Беларусі няма той групы людзей і таго чалавека, які можа згарнуць нашы адносіны з Расіяй. Мы заўсёды будзем будаваць узаемавыгадныя, брацкія, самыя цёплыя адносіны з гэтай краінай».

«ІСЦІ СВАІМ ШЛЯХАМ»

«Азіраючыся вакол і аналізуючы сучасныя тэндэнцыі, мы разумеем, наколькі ўразлівым можа быць свет і як хутка, раптоўна можна страціць тое, што стваралася стагоддзямі. ***Ва ўмовах глабальнай нявызначанасці беларуская стратэгія развіцця можа быць толькі адна: ісці сваім шляхам, думаць сваёй галавой, жыць уласным розумам, будаваць будучыню на трывалым падмурку народнага адзінства.***

Усе беларусы, хто згодны са мной ці не, памятайце: ***іншай зямлі ў нас не будзе. Гэта — Богам дадзеная, іншай зямлі не заваюем і не трэба. Гэту трэба асвоіць. Іншай зямлі для захавання і будаўніцтва нашай дзяржавы таксама не будзе.***

Краіна ўпэўнена рухаецца наперад, у яе ёсць неабходныя для гэтага рэсурсы, воля, сілы, падтрымка саюзнікаў і партнёраў. Я ганаруся ўсімі вамі! Не толькі тымі, хто сядзіць у гэтай зале, але вамі — перш за ўсё. Вы — найлепшыя, вы — эліта нашай краіны. Беларусы пераадолелі кінутыя выклікі, сталі мацнейшыя, мудрэйшыя. Зразумелі: сіла ў адзінстве, і нам ёсць за што змагацца і ёсць што губляць.

Мы зберажом і прымножым матэрыяльную і духоўную спадчыну пакаленняў, перададзім нашчадкам суверэнную і незалежную дзяржаву, наш агульны дом, дзе яны заўсёды будуць адчуваць сябе ў бяспецы і камфорце. Гэта і ёсць наш шлях! І праўда (а ў ёй сіла) — на нашым баку!

Гэты палітычны год, нягледзячы на ўсе цяжкасці, стане годам абнаўлення і пазітыўных пераўтварэнняў, нягледзячы ні на якія санкцыі. Вось пабачыце. Гэта напоўніць новым зместам беларускую мадэль развіцця, разняволіць рэзервы ва ўсіх сферах жыцця. Я перакананы, што за мяжой будуць вучыцца ў Беларусі, пераймаць беларускую мадэль развіцця, у аснове якой — справядлівасць і чалавечнасць.

Мы смела гаворым пра будучыню, таму што чэрпаем сілы з вечных вытокаў, якія сфарміравалі непаўторнае аблічча і шлях беларускай нацыі. ***Мы багатыя нашай гісторыяй. Пераемнасцю каштоўнасцяў, традыцый, звычаяў, уяўленняў аб дабры і зле, аб належным і непрымальным.*** Мы ўзгадаваны нашай зямлёй — непаўторнай беларускай прыродай, лясамі, азёрамі, палямі, чыстым паветрам. ***Гэта сапраўды ідэальнае месца для жыцця чалавека. І гэта заўжды будзе з намі».***

Даслоўна

ПРА ДЗЯЦЕЙ-БЕЛАРУСАЎ, АЭС І ДЭМАКРАТЫЮ ПА-БЕЛАРУСКУ

Прэзідэнт Беларусі амаль гадзіну адказваў на пытанні гасцей Паслання

Кіраўніку дзяржавы задалі больш за дзясятак надзённых пытанняў: пра ўнутраную палітыку, міжнародныя адносіны, грамадскія праблемы, а хтосьці звяртаўся з падзякамі і просьбамі. Так, дэпутат Алег Гайдукевіч перадаў падзяку ад сям'і за затрыманне злачынцаў, што спрабавалі спаліць яго дом. Урач-інтэрн Ганна Казлова папрасіла садзейнічаць наведванню Палаца Незалежнасці, а прадстаўнік прадпрымальніцкай супольнасці Андрэй Капыток — аб прэзідэнцкай нарадзе з кіраўнікамі бізнес-асацыяцый.

«Мы ніколі не будзем крыніцай вайны»

Галіна Бяляева, завуч школы № 34 горада Магілёва, запытала пра верагоднасць накіравання беларускіх салдат-тэрміновікаў на баявыя дзеянні на чужую тэрыторыю.

Аляксандр Лукашэнка сцвярджае, што Беларусь «ніколі не будзе крыніцай вайны». «Я ніколі нідзе не казаў і не скажу, што я пашлю на чужую тэрыторыю, супраць нейкага народа (упасі Гасподзь, Украіны) ваяваць. Я мірны чалавек і такіх загадаў не аддаю», — запэўніў кіраўнік краіны.

Ён перакананы: армія ў Беларусі існуе толькі для таго, каб абараняць сваю тэрыторыю і народ у выпадку нападзення.

«Справа не толькі ў грашах»

Генадзь Бычко, намеснік старшыні Астравецкага райвыканкама, пацікавіўся магчымасцю будаўніцтва ў краіне другой атамнай электрастанцыі.

Прэзідэнт пачаў з таго, што рашэнне будаваць першую станцыю было апраўданае: электраэнергія запатрабавана на знешнім і ўнутраным рынках.

«Калі б была другая атамная станцыя, было б увогуле выдатна. Нам вельмі мала неабходна было б прыроднага газу. Ядзернае паліва ў атамнай станцыі каштуе 150 мільёнаў долараў і загружаецца на 5-6 гадоў. Эканомім вялікія грошы. І справа не толькі ў грашах — гэта чыстая энергія», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, будаўніцтва АЭС — сусветны трэнд, і свае рэактары хочуць мець многія краіны. Дыялог аб будаўніцтве другой АЭС зараз вядуць з некалькімі партнёрамі, у тым ліку і з Расіяй.

«Хто прапануе больш выгадныя ўмовы, з тым і дамовімся. Гэта пытанне не знятае. Але казаць, што заўтра пачнём будаваць, рана. Я хацеў бы пабудаваць яшчэ адну АЭС на ўсходзе краіны, але танней, кажуць спецыялісты, будзе будаваць яшчэ два блокі каля Астравецкай станцыі», — расказаў Прэзідэнт.

«Іх ніхто не падтрымае»

Журналістка інфармацыйнага агенцтва «Мінская праўда» запыталася пра стаўленне кіраўніка краіны да таго, што апаненты ўлады прапанавалі свой варыянт Канстытуцыі Венецыянскай камісіі.

«Калі яны разумныя людзі, разумеюць, што не туды трэба несці праект альтэрнатывы. А ўчора трэба было пакласці на стол Прэзідэнту... Але яны гэтага не зрабілі — значыць, ім не трэба. Яны ведаюць, што іх ніхто не падтрымае», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанне, ён нагадаў пра платформу апазіцыі «Голас», якая займалася параўнаннем галасоў за кандыдатаў на прэзідэнцкіх выбарах у 2020 годзе.

«У нас шмат спецыялістаў, якія могуць яе «паваліць» на працягу гадзіны, і яна не будзе працаваць. Я ім сказаў, каб не чапалі. Вы ім закіньце туды нашы даныя, што ж яны будуць рабіць? Калі мы далі, яны закрылі гэты «Голас», — нагадаў выпадак Прэзідэнт.

«Гэта ім толькі на карысць»

Першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў папрасіў Прэзідэнта падтрымаць ініцыятыву аб'явіць будаўніцтва музея ў Хатыні ўсебеларускай маладзёжнай будоўляй.

«Без праблем, — заўважыў кіраўнік дзяржавы і папрасіў прэм'ер-міністра і кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта разглядзець прапанову. — Калі мы яшчэ нешта ствараем, давайце перададзім нашым «камсамольцам» аб'ект, няхай займаюцца. Гэта ім толькі на карысць».

«Не пры нашым жыцці»

Дэпутат Валянцін Семяняка запытаўся пра перспектывы змянення адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання краіны ў сувязі з рэфармаваннем Канстытуцыі.

«Гэта на будучыню. Калі нехта захоча павялічыць колькасць абласцей, аб'яднаць ці раз'яднаць, то гэта будзе вызначацца законам. Ні Прэзідэнт, ні губернатар не прыме аднаасобнае рашэнне. Гэта працэдура ідзе праз парламент і подпіс кіраўніка краіны. Сёння нам няма ніякай неабходнасці гэтым займацца, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта не пры нашым жыцці. Калі нехта вырашыць, мы ў Канстытуцыі гэта абазначылі, як неабходна рабіць».

«Гэта пытанне адкрытае»

Аляксей Аўдонін, аналітык БІСД, заклапочаны месцам грамадзянскай супольнасці пры фарміраванні складу Усебеларускага народнага сходу.

Адным з першых законапраектаў, які будзе прыняты ў выпадку падтрымання праекта Канстытуцыі, стане закон аб грамадзянскай супольнасці, акцэнтаваў Прэзідэнт, адказваючы на пытанне.

«Там (у УНС. — **«Зв.»**) будуць дэлегаты ад грамадзянскай супольнасці. Потым вызначымся, як і колькі іх будзе. Пакуль мы не прымем закон аб грамадзянскай супольнасці, пра гэта і казаць не трэба. Таму адразу, калі народ падтрымае на рэферэндуме змяненні, мы адным з першых законапраектаў прымаем закон аб грамадзянскай супольнасці», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

І грамадзянская супольнасць будзе складацца, на думку Прэзідэнта, з актывістаў, якія праявілі сябе на працягу апошніх гадоў. Пытанне, хто з іх увойдзе ў УНС, яшчэ мае быць абмеркаванае.

«Мы потым вызначымся, з каго будзе складацца грамадзянская супольнасць і як з яго па колькасці, тэрытарыяльна фарміраваць дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. То-бок гэта пытанне адкрытае», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

«Дэмакратыя — правы людзей»

Прадстаўнік «МІТСО» пацікавіўся ў Прэзідэнта, што ўяўляе сабой «дэмакратыя па-беларуску»?

Па словах кіраўніка краіны, ніхто яшчэ не выпрацаваў адзіных стандартаў дэмакратыі ў свеце, але дэмакратыя — гэта ўлада народа.

«Рэферэндум — элемент дэмакратыі. Дэмакратыя — гэта перадусім правы людзей. І я разумею, што правы ідуць разам з абавязкамі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

«Справа не ў тэрмінах»

Сенатар Алег Раманаў запытаў, якую колькасць тэрмінаў на пасадзе Прэзідэнта Аляксандр Лукашэнка лічыць аптымальнай для аднаго чалавека.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што ён прыхільнік двух тэрмінаў прэзідэнцтва. «Гэта вельмі цяжкая ноша. Калі працаваць па-сапраўднаму, за два тэрміны выпрацуецца так, што далей няма куды. Запомніце, што ў 38 гадоў вы больш Прэзідэнта не выберацe. Гэта будзе чалавек за 50. Таму калі ён да 70 яшчэ папрацуе Прэзідэнтам, гэта будзе нармальна», — растлумачыў ён.

«Многія спытаюць: «А ты?» Ведаеце, сітуацыя так складвалася. І дзякуй Богу, што тады мною былі прыняты адпаведныя рашэнні. Тады мне давялося дзейнічаць таму, што мяне не адпускала сітуацыя», — сказаў Прэзідэнт. Беларускі лідар растлумачыў, што ў прынцыпе «справа не ў тэрмінах». «Цяпер не сярэдзіна 1990-х, калі на прылаўках нічога не было, бандытызм захліснуў краіну. Мы выйшлі на рэферэндум. Я ўзгрузіў на сябе тую Канстытуцыю, якая і сёння са зменамі і дапаўненнямі дзейнічае. Сітуацыя зараз іншая. Двух тэрмінаў дастаткова», — рэзюмаваў ён.

«Чулліва рэагую на забойства жывёл»

Дэпутат Марыя Васілевіч запытала меркаванне Прэзідэнта пра неабходнасць удасканальвання заканадаўства ў сферы аховы жывёл.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што для яго непрымальныя тры рэчы — плач дзіцяці, згвалтаванне жанчын і забойства жывёлы.

«Я вельмі чулліва рэагую на забойства жывёл. Таму, калі вы і дэпутаты побач з вамі распрацуеце адпаведны законапраект, які збярэ ўсё найлепшае ў свеце і расійскі вопыт, гатовы падключыцца да прыняцця гэтага законапраекта па-за плана, што мною зацверджаны, гэта будзе правільны ход», — дадаў кіраўнік краіны.

«Дзякуй богу, што я не сышоў ад апошніх выбараў»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць слушным, што прыняў рашэнне ўдзельнічаць у мінулых прэзідэнцкіх выбарах.

«Дзякуй богу, што я не сышоў ад апошніх выбараў. Гэта не мая заслуга — Качанавай. Калі мы сабраліся, я сказаў: «Час і гонар ведаць. Колькі можна? Я проста хачу спакойна пажыць», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар нагадаў: «Я пайшоў на выбары, каб потым, як Качанава сказала, вы мяне не папракнулі. Я даслоўна сказаў: «Калі раптам потым краіна перакуліцца і нешта здарыцца не так, вы ж мне гэтага не даруеце, скажаце, што сышоў ад гэтых выбараў. І я пайшоў. Я ж не вёў перадвыбарную кампанію. Я сустрэўся з актывам, расказаў, што адбываецца. Сказаў: ідзіце, кажыце народу, як будзем жыць далей».

Разам з тым, паводле слоў Прэзідэнта, ён заклікаў падпісвацца за альтэрнатыўных кандыдатаў. «Тады ж я сказаў, што калі за мяне не прагаласуюць, я не пакрыўджуся. Я гатовы быў, што вы выберыце іншага Прэзідэнта. Нікога я не гнабіў, нікога не саджаў дзеля таго, каб ён не быў прэзідэнтам. Гэта былі жулікі. Я бачу, што адбываецца», — падкрэсліў ён.

Раней па ходзе Паслання кіраўнік дзяржавы адрасаваў беларускаму народу тры пытанні: «Ці гатовы вы, беларусы, плаціць за ўласную абарону, за ўласную дзяржаву?», «Вы гатовы плаціць за гэту дарагую рэч, імя якой — суверэнітэт і незалежнасць?» і «Ці гатовыя вы быць ініцыятыўнымі і працаваць на сябе?» Чацвёртае пытанне прагучала ў дадатак папярэднім.

«А КАЛІ Б ЛУКАШЭНКІ НЕ БЫЛО Ў ЖНІЎНІ 2020 ГОДА, ШТО БЫЛО Б?»

«Прабачце за нясціпласць. Я ўжо адказваў на гэтае пытанне. Я тады з дзіцем па вуліцы з аўтаматам бегаў не таму, каб сябе паказаць. Гэта была небяспека. Я бегаў і абараняў сваё, таму што я гэта стварыў сваімі рукамі разам з вамі. Але я быў напярадзе, я прымаў рашэнні гэтыя. І вас абараняў як сваіх дзяцей. Я вас не мог кінуць. І маё жыццё тады нічога б не каштавала. Так рашуча я быў настроены. І не дай бог, іншы быў бы Прэзідэнт», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Меркаванні

Аляксей АЎДОНІН, аналітык БІСД:

«Чаканні напярэдадні Паслання сёння не толькі спраўдзіліся, але і пашырыліся. Мы атрымалі ад кіраўніка краіны адказ на тэмы, якія дэлегаты абмяркоўвалі раней: эканоміка, сацыяльная сфера, бяспека. Трэба адзначыць, што выступленне было не фармальным, тут агучаны ключавыя пасылы да ўсіх органаў улады, сілавых структур, беларускага грамадства і знешніх партнёраў. Важна, што Прэзідэнт не пабаяўся закрануць вострыя пытанні: знешнепалітычныя сітуацыя, эканоміка. Было дакладна вызначана, што мы знаходзімся ў складанай знешнепалітычнай сітуацыі. Але разам з тым у нас ёсць усе рэсурсы для мабілізацыі, перабудовы, адаптацыі да гэтых пагроз».

Вольга ЧАМАДАНАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама:

«Самае галоўнае, аб чым казаў кіраўнік дзяржавы на працягу свайго выступлення, што мы, беларусы, — адна нацыя. Сёння ў нас ёсць усе ўмовы для таго, каб наша дзяржава развівалася. Асаблівы акцэнт, які я адзначу з выступлення, — моладзь. Так, трэба шчыра казаць, што маладому пакаленню не варта нечага чакаць, неабходна працаваць дзеля жадання. Ніколі нічога проста так у жыцці не даецца. Усяго трэба дабівацца самому. Я не сумняваюся, што словы Прэзідэнта прапусціў праз сябе кожны прысутны ў зале».

Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту:

«Усё, што неабходна было сёння пачуць для нашай сферы, мы пачулі. Уся краіна пачула адказы на пытанні з разнастайных сфер. Гэта вельмі важна для нас. Беларусь — стабільная, квітнеючая краіна, якая будзе яшчэ лепшай. Самае галоўнае для спартсменаў — трэніравацца, працаваць і паказваць вынікі. Работа ўсёй галіны спорту мэтанакіравана на развіццё і вынік».

Аляксей ТАЛАЙ, параалімпіец:

«Я пачуў у выступленні, што мы гатовы да любых падзей. Гатовы да ўсяго і нашы Узброеныя Сілы, а галоўным знешнепалітычным саюзнікам у абароне граніц з'яўляецца Расія. Наша краіна гатова да любых нападаў з-за межаў: эканамічныя санкцыі, магчымыя ваяўнічыя пагрозы суседніх краін. Галоўнае, што народ разумее: мір на сур'ёзнай мяжы, адбываюцца значныя падзеі. Асноўная задача беларусаў — выстаяць, не наламаць дроў, але не аддаць сваё. Суверэнітэт, нашы нацыянальныя інтарэсы — непарушныя».

Матэрыялы падрыхтавала Марыя ДАДАЛКА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Наш арыенцір — не грамадства спажывання, а грамадства адукаваных і свядомых грамадзян, асэнсавана ўцягнутых у стварэнне роднага дома — нашай Беларусі

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. КАЧАНАВАЙ на закрыцці сёмай пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

Упэўнена: усе мы знаходзімся пад уражаннем ад магутнага і яркага выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, паважанага Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. У сваім Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь кіраўнік дзяржавы абазначыў асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі краіны.

Сённяшняе Пасланне асаблівае. І не толькі таму, што яно адбылося напярэдадні канстытуцыйнага рэферэндуму, і не таму, што ў перспектыве такі фармат можа выкарыстоўвацца для зваротаў кіраўніка дзяржавы да Усебеларускага народнага сходу. Аляксандр Рыгоравіч надаў гэтай падзеі новае гучанне, назваўшы яе як тры пытанні беларускаму народу.

Пытанне першае. Ці гатовыя мы, беларусы, плаціць за ўласную абарону, за ўласную дзяржаву?

Пытанне другое. Ці гатовыя мы, беларусы, плаціць за дарагую рэч, імя якой — суверэнітэт і незалежнасць?

І трэцяе пытанне. Ці гатовыя мы, беларусы, быць ініцыятыўнымі і працаваць на сваю сям'ю, на сябе?

Наш Прэзідэнт заклікаў усіх нас глыбока асэнсаваць сфармуляваныя пытанні. Разам з тым мне думаецца, што для сапраўдных патрыётаў Беларусі адказ на гэтыя пытанні будзе абсалютна відавочны. Адказ можа быць толькі адзін: дзеля сваёй роднай краіны, абароны яе суверэнітэту і незалежнасці, захавання дасягнутага дабрабыту і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні мы гатовыя зрабіць усё і ісці да канца.

У завяршэнне мерапрыемства кіраўнік дзяржавы, паважаны Аляксандр Рыгоравіч, агучыў яшчэ адно пытанне. Калі б наш кіраўнік не быў з намі ў 2020 годзе, што стала б з краінай? Адказ на гэтае пытанне таксама відавочны: Рэспублікі Беларусь ужо б проста не было.

Вы шмат разоў чулі маё меркаванне аб гэтым. Хто б што ні казаў, я заўсёды разумела: у нашай краіне ёсць чалавек, які заўжды будзе стаяць за свой народ і за сваю краіну — наш Прэзідэнт. Беларусам проста пашанцавала, і мы павінны цаніць дадзены лёсам шанц жыць і працаваць у краіне пад кіраўніцтвам нашага Прэзідэнта.

Абазначаныя нашым кіраўніком дзяржавы ўстаноўкі і задачы павінны быць прамым кіраўніцтвам да дзеяння для ўсіх нас. Нам неабходна безумоўна прытрымлівацца іх у сваёй прафесійнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці, сувымяраць з імі свае ініцыятывы і прымаць рашэнні.

Наш абавязак — давесці ключавыя тэзісы Паслання Прэзідэнта да максімальна шырокай аўдыторыі.

Неабходна правесці маштабную тлумачальную кампанію для нашых грамадзян — працягвайце сустрэчы ў працоўных калектывах і з людзьмі па месцы жыхарства, удзельнічайце ў дыялогавых пляцоўках і інфармацыйна-прапагандысцкіх групах. Прыцягвайце да гэтай работы дэпутатаў усіх узроўняў.

Выступайце ў сродках масавай інфармацыі, задзейнічайце для гэтых мэт інфармацыйныя рэсурсы Савета Рэспублікі і персанальныя старонкі ў сацыяльных сетках. Але памятайце: работа ў інфармацыйнай прасторы не адмяняе, а толькі дапаўняе жывыя чалавечыя зносіны.

Важна арганізаваць гэту работу ў фармаце дыялогу. Трэба ведаць і разумець, што людзі думаюць аб праблемах, закранутых кіраўніком дзяржавы, і якія шляхі вырашэння іх бачаць. Зваротная сувязь дасць магчымасць дасягнуць максімальнага выніку ў рэалізацыі праграмных установак нашага Прэзідэнта. Фармалізм, абыякавасць і дыстанцыраванасць у гэтай справе проста недапушчальныя.

Шукайце магчымасці данесці тэзісы Паслання і да нашых суайчыннікаў за мяжой — праз дыяспары беларусаў, узаемадзеянне з гарадамі-пабрацімамі, грамадскія ініцыятывы, асабістыя кантакты. Выкарыстоўвайце свае парламенцкія і прафесійныя магчымасці для таго, каб даць гэту інфармацыю саюзнікам, стратэгічным партнёрам і краінам, гатовым да канструктыўнага супрацоўніцтва з намі.

У гэты адказны перыяд мы ўсе павінны асабліва актыўна падтрымліваць палітычны курс дзяржавы.

Гэта датычыцца не толькі галасавання на рэферэндуме, але і тых дынамічных абнаўленняў беларускай грамадска-палітычнай сістэмы, якія нам разам трэба прайсці. Наш Прэзідэнт заклікаў усіх нас да напружанай работы, якая дасць магчымасць не толькі захаваць краіну ў «жорнах новага перадзелу свету», але і ўпэўнена будаваць нашу будучыню.

Для Савета Рэспублікі справа гонару — непасрэдна ўнесці важкі ўклад у практычную рэалізацыю палажэнняў Паслання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь. У зоне нашай увагі і адказнасці могуць быць выдзелены наступныя **ключавыя кірункі.**

Першы. Своечасовая актуалізацыя дзеючага заканадаўства.

Прыярытэтным кірункам заканатворчай дзейнасці застаецца прыняцце нарматыўных прававых актаў, накіраваных на забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Мы і надалей будзем супрацьстаяць любым спробам падрыву палітычнай і сацыяльна-эканамічнай стабільнасці ў нашай краіне. Усе абавязаны паважаць закон.

Паралельна неабходна распрацоўваць прававыя механізмы, якія забяспечваюць далейшую рэалізацыю Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады. Пачатая работа над значнымі для грамадства законапраектамі, накіраванымі на развіццё культуры, спорту, забеспячэнне сацыяльнай інтэграцыі людзей з інваліднасцю, аказанне псіхалагічнай дапамогі, павінна быць завершана ў аптымальныя тэрміны.

І, нарэшце, нам раз і назаўсёды трэба развянчаць існуючы стэрэатып, што прыняцце законаў — гэта доўга. Калі ўзнікае пытанне, якое патрабуе заканадаўчага ўрэгулявання, трэба аператыўна прымаць рашэнні. Як паказвае практыка, узгадненні і экспертызы законапраекта, яго разгляд парламентарыямі і ўнясенне на подпіс кіраўніку дзяржавы могуць быць ажыццёўлены ўсяго за некалькі тыдняў. Цяганіна ў прыняцці законаў проста недапушчальная.

Адзін з першых законапраектаў, які трэба распрацаваць пры прыняцці змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі, будзе прысвечаны грамадзянскай супольнасці. У гэтым дакуменце трэба вызначыць, што такое грамадзянская супольнасць, якая яе сутнасць і структура, і ўрэгуляваць іншыя пытанні. Гэта створыць прававую аснову для развіцця канструктыўных грамадскіх структур і ініцыятыў.

Другі. Аператыўнае вырашэнне праблем, якія хвалююць нашых грамадзян.

Нязменным застаецца сацыяльна арыентаваны вектар развіцця Беларусі. У цэнтры нашай палітыкі — чалавек з яго патрэбамі і праблемамі. Справядлівасць, адказнасць дзяржавы, клопат аб людзях — простыя і зразумелыя прынцыпы гэтай палітыкі, якія выкрышталізаваліся за гады незалежнасці нашай краіны і на якіх выхоўваецца беларускае грамадства.

Як рэалізоўваюцца прынятыя парламентарыямі законы, нацыянальныя праекты, стратэгіі і праграмы развіцця краіны, як гэта ўсё ўспрымаецца грамадствам — можна даведацца толькі з непасрэднай і шчырай размовы з нашымі грамадзянамі. Менавіта таму прыярытэтам Савета Рэспублікі заўсёды з'яўляецца работа з насельніцтвам.

Як і раней, для гэтага неабходна задзейнічаць самыя розныя формы — асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі, насельніцтвам па месцы жыхарства, дыялогавыя пляцоўкі, адзіныя дні інфармавання, выступленні ў сродках масавай інфармацыі. Важна быць шчыра зацікаўленымі, не заставацца абыякавымі, кожнае пытанне даводзіць да лагічнага завяршэння, дзейнічаць сістэмна.

Асобным кірункам работы застаецца маніторынг цэн. Людзі не павінны адчуць на сабе ніякіх негатыўных наступстваў знешняга ціску на Беларусь.

Нам трэба ўзяць за правіла той тэмп, фармат і маштаб работы з насельніцтвам, якія мы практыкавалі падчас грамадскіх абмеркаванняў змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У дыялог было ўцягнута ўсё грамадства, практычна кожны грамадзянін — гэта ўнікальны вопыт, якому, упэўнена, няма аналагаў ні ў адной краіне свету.

Трэці. Выхаванне грамадства адукаваных і свядомых грамадзян.

У сваім звароце Аляксандр Рыгоравіч мудра адзначыў: «Жыццяздольнасць нацыі наўпрост залежыць ад глыбіні і багацця духоўнай спадчыны, якую мы прымножым і перададзім будучым пакаленням. Наш арыенцір — не грамадства спажывання, а грамадства адукаваных і свядомых грамадзян, асэнсавана ўцягнутых у стварэнне роднага дома — нашай Беларусі».

Савет Рэспублікі павінен актыўна ўключыцца ў працэс выхавання нашага грамадства, галоўнымі стаўпамі каштоўнаснага падмурка якога выступаюць імкненне да міру і адзінства, нацыянальна-дзяржаўная ідэнтычнасць, пераемнасць і баланс культур, гарманічнасць этнаканфесіянальных адносін, шанаванне сям'і як саюза мужчыны і жанчыны. Трэба культываваць у нашых людзях дух гераізму продкаў, якія абаранілі краіну ў Вялікай Айчыннай вайне.

У нас ёсць вопыт правядзення выязных пасяджэнняў прэзідыума па пытаннях фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму ў студэнцтва, грамадска-дзяржаўнага партнёрства ў вырашэнні праблем п'янства і алкагалізму, круглых сталоў да Дня народнага адзінства, «Чысціня слова — чысціня душы», «Фарміраванне і рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў». Гэты кірунак трэба істотна актывізаваць. Арыенцір у гэтай рабоце — у першую чаргу падрастаючае пакаленне.

Заклікаю вас весці з моладдзю размову на роўных, так сёння адзначыў наш Прэзідэнт, без фармалізму і фальшу. Нам неабходна тлумачыць маладым людзям, што нічога не ўзнікае з ніадкуль і не даецца проста так, смялей патрабаваць з іх за вынікі дзейнасці, патрабаваць цвёрдасці і дзёрзкасці, самааддачы і ахвярнасці ў імя агульнага дабрабыту. І гэта маладыя людзі павінны разумець.

Чацвёрты. Захаванне гістарычнай памяці.

У бягучы год — Год гістарычнай памяці — трэба быць актыўнымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў, прысвечаных знакавым для Беларусі датам і юбілеям, звязаным з гісторыяй, навукай, культурай. Больш за тое, нам трэба выступаць ініцыятарамі такіх мерапрыемстваў і арганізоўваць іх на сваіх пляцоўках, аб'ядноўваючы патрыётаў і неабыякавых грамадзян нашай краіны.

Савет Рэспублікі павінен садзейнічаць рэалізацыі ініцыятывы Генеральнай пракуратуры па маштабным расследаванні злачынстваў супраць беларускага народа. Мы абавязаны расказаць нашым грамадзянам і ўсяму свету праўду аб нацысцкай палітыцы генацыду на тэрыторыі Беларускай ССР, а таксама разам з упаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі дабівацца прызнання і асуджэння генацыду беларускага народа на міжнародным узроўні.

Як сказаў у сваім выступленні наш Прэзідэнт, сёлета мы павінны імкнуцца да таго, каб напоўніць наша новае свята — Дзень народнага адзінства — фактамі і імёнамі.

Пяты. Актыўнае прасоўванне нацыянальных інтарэсаў метадамі парламенцкай дыпламатыі.

Адносіны Беларусі і Расіі закладваюць стандарты для ўзаемадзеяння з дзяржавамі, якія гатовы развіваць з намі адносіны на аснове ўзаемапавагі і раўнапраўя. У нас наладжваецца цеснае парламенцкае супрацоўніцтва з калегамі з Расійскай Федэрацыі як на двухбаковай аснове, так і ў складзе інтэграцыйных аб'яднанняў ЕАЭС, СНД.

Галоўная наша задача на найбліжэйшую перспектыву — актыўна ўключыцца ў маштабную работу па прадаўжэнні ўніфікацыі, гарманізацыі і збліжэння заканадаўстваў Беларусі і Расіі. У першую чаргу трэба прапрацаваць пытанні міграцыйнага заканадаўства.

Відавочна, што дзейнасць саюзных парламентарыяў не павінна абмяжоўвацца рамкамі заканатворчасці — трэба разам прапрацоўваць актуальныя кірункі супрацоўніцтва, вызначаць пункты прыкладання сумесных намаганняў на перспектыву і канкрэтна працаваць па рэалізацыі двухбаковых эканамічных і гуманітарных праектаў.

У Пасланні абсалютна слушна прагучала, што ўзорнае ўзаемадзеянне ў Азіі ў нас выбудавана з Кітаем, з якім у студзені мы адзначылі 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. На мінулым пасяджэнні Савет Рэспублікі адобрыў змяненні ў законы па пытаннях дзейнасці Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Нам і ў далейшым трэба імкнуцца да таго, каб Рэспубліка Беларусь была прывабная для такога роду інвестыцыйных праектаў.

Мы нацэлены на захаванне і пашырэнне існуючых цесных парламенцкіх сувязяў з постсавецкімі краінамі.

Трэба больш інтэнсіўна развіваць узаемадзеянне з парламентарыямі нашых *саюзнікаў па АДКБ*. На пасяджэннях Парламенцкай Асамблеі, мерапрыемствах пад эгідай Арганізацыі мы павінны быць ініцыятыўнымі. Уклад Савета Рэспублікі ў павышэнне эфектыўнасці дзейнасці Парламенцкай Асамблеі АДКБ павінен быць адчувальны.

У адносінах з заходнімі суседзямі — Польшчай і Літвой — мы павінны зыходзіць з прагматычных меркаванняў, пры гэтым адказваючы на іх дзеянні суразмерна.

Усведамляючы спецыфіку гібрыднага ўздзеяння і разумеючы, што міграцыйная сітуацыя на беларуска-польскай граніцы — гэта, верагодна, не апошняя правакацыя ў адносінах да нашай краіны, трэба будзе выпрацаваць прававую і гуманітарную аснову для рэагавання на такія выклікі. У якасці прыкладу можа быць выкарыстаны станоўчы вопыт нашых дзеянняў канкрэтна ў гэтай сітуацыі.

На жаль, у нас практычна прыпынена парламенцкае ўзаемадзеянне з яшчэ адной блізкай краінай — Украінай. У найбліжэйшы час трэба прапрацаваць кантакты з канструктыўна настроенымі ўкраінскімі калегамі і наладзіць дыялог з імі.

У цяперашніх рэаліях важна падтрымліваць цесныя адносіны з усімі дружалюбнымі краінамі ў розных рэгіёнах свету — Еўропе, Азіі, Афрыцы, Лацінскай Амерыцы. Галоўнае патрабаванне — парламенцкая дыпламатыя павінна садзейнічаць выбудоўванню нармальных, добрасуседскіх і ўзаемавыгадных адносін, прыносіць канкрэтную карысць нашай краіне.

Самае важнае, што кіраўнік дзяржавы абазначыў у сваім выступленні, — гэта **беларуская стратэгія развіцця.** Аляксандр Рыгоравіч падкрэсліў:

«Ва ўмовах глабальнай нявызначанасці беларуская стратэгія развіцця можа быць толькі адна — ісці сваім шляхам, думаць сваёй галавой, жыць уласным розумам, будаваць будучыню на трывалым падмурку народнага адзінства».

Усе дзяржаўныя органы павінны быць яшчэ больш мэтанакіраванымі, згуртавацца ў вырашэнні дзяржаўных задач. Нам трэба выбудоўваць такія механізмы ўзаемадзеяння, каб не толькі паспяваць адаптавацца да змен, якія адбываюцца ў свеце, але і фарміраваць новыя пункты росту, праводзіць запатрабаваныя і пазітыўныя пераўтварэнні.

Зберагчы і прымножыць матэрыяльную і духоўную спадчыну пакаленняў, перадаць нашчадкам суверэнную і незалежную дзяржаву, наш агульны дом, дзе яны заўсёды будуць адчуваць сябе ў бяспецы і камфорце, — гэтыя арыенціры павінны стаць для нас не проста прафесійным абавязкам, а маральным абавязкам і прынцыпам, нашым крэда, якога мы будзем свята прытрымлівацца па жыцці.

Як сказаў наш Прэзідэнт, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка: **«Гэта і ёсць наш шлях, і праўда — а ў ёй сіла — на нашым баку!»**

Наша найпершая задача — захоўваць адзінства грамадства, яго згуртаванасць вакол блізкіх усім нам каштоўнасцяў

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. АНДРЭЙЧАНКІ на закрыцці сёмай пазачарговай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Паважаныя калегі!

Мы завяршаем сёмую пазачарговую сесію Палаты прадстаўнікоў.

Сённяшняе Пасланне кіраўніка дзяржавы стала кульмінацыяй шырокага грамадскага дыялогу, які вызначае стратэгію развіцця краіны на найбліжэйшыя дзесяцігоддзі.

Пасланне змяшчае дэталёвую характарыстыку сітуацыі ў Беларусі і вакол яе, дае адказы на няпростыя, але жыццёва важныя пытанні, пастаўленыя часам.

Гэта перш за ўсё надзейная абарона суверэнітэту, забеспячэнне бяспекі Беларусі, павышэнне якасці жыцця грамадзян і, безумоўна, умацаванне пачаткаў народаўладдзя, удасканаленне архітэктуры дзяржаўнага кіравання.

У гэтым сэнсе Пасланне — праграмны дакумент, у якім абазначаны дакладныя задачы для ўсіх дзяржаўных органаў, у тым ліку для Парламента.

Наша найпершая задача — захоўваць адзінства грамадства, яго згуртаванасць вакол такіх блізкіх усім нам каштоўнасцяў, як мір, сацыяльная справядлівасць, магчымасць самастойна ствараць сваю будучыню.

Менавіта на гэта накіраваны праект змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, вынесены кіраўніком дзяржавы на агульнанацыянальны рэферэндум.

Дэпутацкі корпус павінен прадоўжыць удзел у інфармацыйна-тлумачальнай рабоце, якая праводзіцца ў краіне напярэдадні рэферэндуму. Часу застаецца няшмат, і яго трэба выкарыстоўваць максімальна эфектыўна.

Вядома, абсалютная большасць грамадзян падтрымлівае курс на захаванне сацыяльнай дзяржавы і эвалюцыйнае развіццё. Аднак з улікам сур'ёзнасці прапанаваных перамен у некаторых яшчэ застаюцца пытанні.

Таму наш абавязак — дастукацца да кожнага. Неабходна растлумачыць сутнасць канстытуцыйных навацый, каб на рэферэндуме людзі зрабілі свядомы выбар, дакладна разумеючы, што лёс краіны сёння знаходзіцца менавіта ў іх руках. Гэта, бадай, самы галоўны тэзіс Пасланння Прэзідэнта беларускаму народу і Парламенту.

Народнае адзінства, захаванне грамадскага міру і згоды наўпрост залежаць таксама ад нашай заканадаўчай дзейнасці, якасці і аператыўнасці заканадаўчых рашэнняў, якія прымаюцца.

Сёння відавочна, што незалежна ад вынікаў рэферэндуму аб'ём заканадаўчай работы будзе нарастаць. Гэтага патрабуе дынаміка сучаснага жыцця.

Пастаянным камісіям трэба паскорыць работу над існуючымі законапраектамі, каб своечасова ўключыць іх у парадак дня сесіі, якая мае адбыцца.

Гэта датычыцца перш за ўсё праектаў эканамічнага блока, аб барацьбе з карупцыяй, аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, Кодэкса аб культуры.

Трэба актыўна падключыцца да працэсу распрацоўкі праектаў законаў, унесеных у план падрыхтоўкі праектаў заканадаўчых актаў на 2022 год. Скараціць тэрміны прыняцця законапраектаў Парламентам можна, толькі забяспечыўшы іх максімальную прапрацоўку і ўзгадненне да афіцыйнага ўнясення ў Палату прадстаўнікоў.

Нельга здымаць з кантролю і пытанні заканадаўчага суправаджэння саюзнага будаўніцтва, рэалізацыі саюзных праграм, якія пашыраюць магчымасці нашых суб'ектаў гаспадарання і павышаюць абароненасць нацыянальнай эканомікі ва ўмовах знешняга ціску і санкцый.

Гэта тыя найбліжэйшыя заканадаўчыя планы, якія ўжо вызначаны. Яны будуць істотна скарэкціраваны ў выпадку адабрэння грамадзянамі абноўленай Канстытуцыі. Неабходна будзе вырашаць прынцыпова новыя задачы па пераглядзе ўсяго масіву дзеючага заканадаўства.

Нам неабходна будзе прыняць асноўныя законы аб Прэзідэнце, Парламенце, Урадзе, выбудаваць дакладную сістэму кіравання.

Асаблівую ўвагу трэба будзе ўдзяліць Закону аб Усебеларускім народным сходзе. Грамадзяне актыўна падтрымалі ідэю надання гэтаму органу канстытуцыйнага статусу, і нам трэба і далей абапірацца на іх думку, раіцца з імі, каб распрацоўка гэтага Закона была максімальна празрыстай, а яго нормы зразумелыя людзям.

Удумлівага, уважанага падыходу запатрабуе таксама распрацоўка законапраекта аб грамадзянскай супольнасці, пра што сёння гаварыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

У ходзе абмеркавання праекта Канстытуцыі выявіўся цэлы пласт прапаноў, якія не могуць быць замацаваны ў Асноўным Законе, але заслугоўваюць самага сур'ёзнага аналізу.

Яны павінны стаць для дэпутатаў зыходным пунктам для падрыхтоўкі новых заканадаўчых ініцыятыў. Гэта тым больш важна, што ў адпаведнасці з новай Канстытуцыяй Парламент стане асноўным заканадаўчым органам краіны.

І, нарэшце, трэба быць гатовымі да таго, каб адкрыць чарговую сесію ў сакавіку бягучага года, паколькі зменіцца і сесійны рэжым работы Парламента.

Усё гэта накладае на нас асаблівую адказнасць, патрабуе максімальнай сабранасці. Таму ўсім пастаянным камісіям, кожнаму дэпутату ўжо цяпер трэба перастроіць формы і метады сваёй работы.

Да гэтага нас падштурхоўвае і міжнародная абстаноўка, складанасць і супярэчлівасць якой была абазначана кіраўніком дзяржавы.

Абарона нацыянальных інтарэсаў і давядзенне да міжнароднай грамадскасці, замежных парламентарыяў аб'ектыўнай інфармацыі аб сітуацыі ў краіне — адна з найважнейшых задач дэпутацкага корпуса і створаных рабочых груп па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў.

Мы не павінны і не будзем мірыцца з практыкай санкцыйнага ціску, выкарыстання заходнімі краінамі двайных стандартаў пры ацэнцы падзей у Беларусі, умяшаннем ва ўнутраныя справы нашай суверэннай дзяржавы.

Менавіта такая пазіцыя была агучана беларускімі дэпутатамі на слуханнях «Канстытуцыйная рэформа ў Беларусі», якія прайшлі днямі ў рамках зімовага пасяджэння Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі, дзе прыняў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах А. У. Савіных.

Аналагічную пазіцыю трэба адстойваць дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на найбліжэйшым зімовым пасяджэнні ПА АБСЕ і вясенняй Асамблеі МПС.

У пачатку лютага беларуская дэлегацыя плануе ўзяць удзел у 36-й Асамблеі Лацінаамерыканскага парламента. Неабходна выкарыстоўваць і сам візіт, і запланаваныя двухбаковыя сустрэчы для прасоўвання эканамічных інтарэсаў Беларусі ў гэтым значным рэгіёне свету.

Важна задзейнічаць і такія новыя фарматы дыпламатыі, як Парламенцкая сетка Руху недалучэння, у якую ўваходзяць амаль 50 дзяржаў свету. Яе чарговае пасяджэнне адбудзецца ў Азербайджане, і трэба ўзяць актыўны ўдзел у яго рабоце.

Паважаныя калегі! Не менш сур'ёзныя задачы ў кантэксце Пасланння кіраўніка дзяржавы нам трэба будзе вырашаць у выбарчых акругах.

Тлумачальная работа з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам, безумоўна, вельмі важная. Але яна можа аказацца неэфектыўнай, калі не будзе падмацавана рэальнымі справамі.

Сёння як ніколі важна дабівацца станоўчага вырашэння тых канкрэтных праблем, з якімі да нас звяртаюцца грамадзяне. Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць пытанням, якія ўплываюць на эмацыянальны фон грамадскага жыцця: занятасць, цэны, даступнасць і якасць сацыяльных паслуг, работа ЖКГ.

Узаемадзейнічайце з прафсаюзамі, мясцовымі Саветамі дэпутатаў, грамадскімі арганізацыямі патрыятычнай накіраванасці.

Трэба актыўна супрацьстаяць спробам выкарыстання рэферэндуму як нагоды для расколу грамадства з боку збеглых і іх апекуноў. А тое, што яны не пакінуць спроб збіць нас з дарогі, мы цудоўна разумеем.

Разам з тым упэўнены, што будучыня за патрыётамі Беларусі, хто словам і справай даказаў сваю адданасць краіне, ідэалам і каштоўнасцям, якія адстойвалі іх бацькі і дзяды. І сёння яны разам з усім беларускім народам пішуць новую старонку гісторыі краіны, пра якую з гонарам будуць успамінаць нашы нашчадкі.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

35 мільёнаў еўрапейцаў выбіраюць паміж аплатай за ацяпленне і пакупкай ежы

Столькі жыхароў Старога Свету з-за росту цэн на энганосьбіты аказаліся перад выбарам — заплаціць за ацяпленне ці купіць ежу. Гэта супастаўна з насельніцтвам Венгрыі, Грэцыі, Ірландыі і Партугаліі разам узятых, паведаміў Euronews. Па ўсёй Еўропе расце колькасць людзей, якім цяжка знайсці грошы на прадукты харчавання і ацяпленне. У Балгарыі рахунак за ацяпленне не можа аплаціць кожны чацвёрты жыхар. Гэта самы вялікі працэнт у Еўрасаюзе. На другім і трэцім месцы — Літва і Кіпр. Дзве асноўныя прычыны энергетычнай беднасці — нізкія даходы грамадзян і дрэнная цеплаізаляцыя жылля. Рэзкае павышэнне цэн на паліва і пандэмія, якая працягваецца, робяць плату за ацяпленне для многіх непад'ёмнай, адзначыў Euronews. На думку дырэктара энергетычнага цэнтра Інстытута Жака Дэлора Тома Пелерэн-Карлена, прычыны энергетычнай беднасці ў Еўропе з'яўляюцца вынікам неэфектыўных рашэнняў, прынятых у мінулым.

МВФ заклікаў Сальвадор адмовіцца ад біткоіна

Міжнародны валютны фонд (МВФ) заклікаў улады Сальвадора адмовіцца ад прызнання біткоіна афіцыйным плацежным сродкам. Эксперты МВФ адзначылі, што гэта стварае сур'ёзныя рызыкі для фінансавай стабільнасці краіны. Як вядома, Сальвадор у верасні мінулага года стаў першай дзяржавай, якая прызнала біткоін афіцыйным плацежным сродкам. Пазней прэзідэнт, 40-гадовы Найіб Букель, заявіў аб намеры размясціць аблігацыі, забяспечаныя біткоінамі, на суму $1 млрд. Рашэнне Сальвадора было з аптымізмам сустрэта супольнасцю крыптавалютных трэйдараў і майнераў, аднак эканамісты адзначалі, што ўлады не ўлічылі патэнцыйныя наступствы магчымага абвалу высока валацільнай крыптавалюты для эканомікі краіны, заўважыла The Wall Street Journal.

Астраномы Аўстраліі знайшлі ў Млечным шляху загадкавы аб'ект

Ён выпраменьвае энергію ў радыёдыяпазоне з раўнамернай перыядычнасцю. Па словах навукоўцаў, нічога падобнага ў Сусвеце астраномам яшчэ не сустракалася. Сваю знаходку яны называюць жудаснай. Першым касмічнае цела ўбачыў аспірант Універсітэта Керціна ў Заходняй Аўстраліі Тайран О'Доэрці з дапамогай тэлескопа і распрацаванай ім самім новай методыкі. Гэта адбылося яшчэ ў канцы 2020-га. Спачатку навукоўцы паставіліся да адкрыцця О'Доэрці даволі спакойна. Але неўзабаве высветлілася, што новы аб'ект учыняе магутны выкід энергіі працягласцю ў хвіліну кожныя 18 хвілін. «Мы не думалі, што такое магчыма, але гэта факт, і ён сведчыць аб тым, што там [у космасе] адбываюцца нейкія экстрэмальныя фізічныя працэсы», —- заўважыла кіраўнік О'Доэрці, астрафізік доктар Наташа Харлі-Уокер з Міжнароднага цэнтра радыёастранамічных даследаванняў (ICRAR).

Год гістарычнай памяці

Падзеі, пра якія нельга забыцца...

Праект «Памяць жыве ў пакаленнях» стартуе ў БДУ

Ён прымеркаваны да Года гістарычнай памяці і накіраваны на захаванне малавядомых, але значных у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны дат, дапаўненне хронікі ваенных гадоў унікальнымі падзеямі, якія дэманструюць гераізм і патрыятызм беларускага народа.

Распрацоўшчыкамі праекта выступілі студэнты і супрацоўнікі гістарычнага факультэта БДУ. Яны дэталёва прапрацавалі асобныя старонкі гісторыі і акрэслілі асобныя даты. Многія з іх у 2022 годзе пройдуць пад эгідай 80-годдзя. Гэта Вандзейская канферэнцыя, дзень масавага знішчэння вязняў Мінскага гета, з'яўленне лагера ў Малым Трасцянцы, стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху, наступленне Чырвонай Арміі ў Сталінградскай бітве.

Акцэнт пры правядзенні тэматычных акцый зробяць на прыцягненні школьнікаў, моладзі і знаёмстве іх з гістарычным мінулым праз наведванне памятных трагічных мясцін Беларусі, сустрэчы са сведкамі вайны. Дарэчы, запланаваны паездкі ў мемарыяльныя комплексы «Хатынь — Дальва», «Чырвоны Бераг» , «Азарычы», Мемарыяльны комплекс ахвярам фашызму ў Бабруйску, Мемарыял ахвярам Гарадзейскага гета ў Нясвіжскім раёне.

Адмысловае месца ў праекце займае горад Маладзечна, дзе за час акупацыі было забіта каля 3000 яўрэяў. Плануецца наведванне помнікаў Вялікай Айчыннай вайны, Мінскага абласнога краязнаўчага музея, Мемарыяльнага комплексу «Шталаг 342», помнікаў воінам, партызанам і ахвярам нацызму.

Першым мерапрыемствам праекта стаў семінар «Гістарычныя мясціны Халакосту: ад Мінскага гета да Аўшвіца», які прайшоў на базе Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны, з удзелам настаўніка гісторыі, былой вязніцы Чарнавіцкага гета Ларысы Александрэнкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by

Продавец: ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. Тел. (0154) 65 25 01

Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

Лот № 1

Здание гаражей (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), инв. номер 430/С-58686 общей площадью 807,2 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка. Адрес: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 47, здание гаражей, северо-западнее д. Новины.
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 05.05.2071 общей площадью 0,2494 га для строительства и обслуживания здания гаражей

Начальная цена с НДС 20 %: 38 520,00 белорусских рублей

Лот № 2

Здание дома механизатора (здание специализированное сельскохозяйственного назначения), инв. номер 430/С-58685 общей площадью 259,1 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка, сарай, навес. Адрес: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 46, здание дома механизатора, северо-западнее д. Новины.
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 05.05.2071 общей площадью 0,1570 га для строительства и обслуживания здания дома механизатора

Начальная цена с НДС 20 %: 20 880,00 белорусских рублей

Лот № 3

Здание ремонтной мастерской (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), инв. номер 430/С-58687 общей площадью 351,7 кв. м. Адрес: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 48, здание ремонтной мастерской, северо-западнее д. Новины.
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 05.05.2071 общей площадью 0,2415 га для строительства и обслуживания здания ремонтной мастерской

Начальная цена с НДС 20 %: 24 120,00 белорусских рублей

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов
Начало торгов: 10.00 **01.03.2022 г.**
Окончание торгов: 11.00 **01.03.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **28.02.2022 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект»,

опубликованной в газете «Звязда» 26.02.2021 г.

по объекту **«Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр-т Жукова» (3-я очередь строительства)**
(3-7-я секции)

Характеристика объекта строительства: Проектной документацией предусматривается в том числе строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 43,94 кв. м, расположенного в 3-й секции на нежилом этаже с обособленным входом непосредственно с улицы с уровня земли.

Высота помещения составляет 3,55 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

Встроенное помещение передается с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенного помещения выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена вертикальная и горизонтальная (в конструкции стяжки пола) разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенного помещения – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенного помещения – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитаза. Электроснабжение встроенного помещения – разводка до вводного устройства с установкой вводного устройства и счетчика. Запроектировано строительство пассивной оптической сети, предусматривающей телефонизацию и телефикацию по протоколу IP и подключение к Интернету по технологии xPON – ввод сетевого кабеля в помещение, оптическая розетка. Встроенное помещение оборудуется автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения – типа «СО-2». По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются офисные помещения по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1 700,00 долларов США.

Условия оплаты: оплата 100 % стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику могут быть предоставлены скидки от общей стоимости объекта, либо иные условия его оплаты.

11 февраля 2022 года состоится
ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
ОАО «Житковичлес»

Повестка дня собрания
Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества.

Дата составления списка акционеров для регистрации участников собрания – 04 февраля 2022 года.
Форма проведения собрания – очная.
Место проведения собрания – по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.
Время проведения собрания – 13.00.
Время регистрации участников собрания: с 12.30 до 12.50.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни с 14.00 до 16.00 с 04 февраля 2022 года по месту нахождения общества: Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, и в день проведения собрания с 10.00 до 12.00 – по месту проведения собрания.

УНП 400049968

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29**

Предмет аукциона:

Лот № 1 – ОФИС (Административное помещение) общей площадью 15,6 кв. м, инв. номер 200/D-193558, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 6 — **Начальная цена с НДС 20 % – 40 920,00 бел. руб.**

Обременение по лотам:
1. Аренда. Подробная информация у Продавца.
2. Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Срок оплаты предмета аукциона:** не позднее 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи. Передача предмета аукциона осуществляется не позднее пяти рабочих дней с момента полной оплаты предмета аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**11.02.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**09.02.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор торгов) информирует о проведении открытого аукциона с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, по продаже помещения гаража пожарного аварийно-спасательного поста № 14 (в т. ч. асфальтобетонное покрытие) с инв. № 332/D-34885, расположенного по адресу: Гомельская обл., Житковичский р-н, Ленинский с/с, 2-2, 0,05 км западнее аг. Ленин, находящегося в собственности Республики Беларусь и принадлежащего на праве оперативного управления Учреждению «Гомельское областное управление МЧС»
Дата проведения аукциона: 28 февраля 2022 г. в 14.00
Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1

Лот № 1

Гараж пожарного аварийно-спасательного поста № 14 (в т. ч. асфальтобетонное покрытие) с инв. № 332/D-34885. Адрес: Гомельская обл., Житковичский р-н, Ленинский с/с, 2-2, 0,05 км западнее аг. Ленин. Назначение: помещение транспортного назначения. Изолированное помещение оценочной стоимостью на 01.01.2021 г. 12 400,00 рублей. Расположено в здании гаражей с инв. № 332/С-34885 1970 года постройки. Общая площадь 78,6 кв. м. **Начальная цена: одна базовая величина. Задаток: одна базовая величина**

Земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания гаражей, в котором расположено помещение, на правах постоянного пользования площадью **0,2393 га (доля 1/12)** с кадастровым номером **321681603101000298. Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0349 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Обязательное условие аукциона – осуществление покупателем предпринимательской деятельности с использованием приобретенного недвижимого имущества продолжительностью не менее трех лет, начиная не позднее одного года со дня заключения договора купли-продажи недвижимого имущества

Местонахождение организатора торгов, контакты: г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: +375 232 32-46-47, 32-18-95; +375 29 170-46-47; сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by, auction-gino@gino.by

Извещение о проведении аукциона опубликовано 27.01.2022 г. на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте ino.by

Извещение о проведении 14 февраля 2022 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе		
Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
Предмет торгов 1. Изолированное помещение* с инв. номером по бухгалтерскому учету 088554 общей площадью 169,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Станционная, 1-17, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение	18 504,00	1 800,00
Предмет торгов 2. Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – электрические сети; капитальное строение* с инв. номером по бухгалтерскому учету 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада. Сведения о земельном участке: площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005	1 826,89	180,00
Предмет торгов 3. Капитальное строение с инв. номером 240/С-44733, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39А общей площадью 1422,1 кв. м; наименование – здание склада с теневым навесом; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – теневой навес, площадка. Сведения о земельном участке: площадь – 0,4652 га, кадастровый номер – 223650100001016130	54 769,20	5 400,00
Предмет торгов 4. Капитальное строение с инв. номером 240/С-44721, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39Б общей площадью 494,6 кв. м; наименование – здание склада (картофелехранилище); назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – пристройка, забор, площадка. Сведения о земельном участке: площадь – 0,2102 га, кадастровый номер – 223650100001016129	21 228,00	2 100,00
Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации, рекомендуется осмотр		

** Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области», отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество. По предмету торгов № 1 имеются ограничения (обременения): аренда до 30.09.2022 г.*

Продавец имущества: ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток (задатки) для участия в аукционных торгах от 14.02.2022 по предмету торгов №__.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **14 февраля 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 01.02.2022 по 10.02.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

Телефоны для справок: (017) 360-42-22, (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

Навука і інавацыі

АД ІНБЕЛКУЛЬТА ДА НАВУКОВА-ВЫТВОРЧАЙ КАРПАРАЦЫІ

Якія амбіцыёзныя задачы стаяць сёння перад беларускімі даследчыкамі?

Акадэмія навук з'яўляецца найбуйнейшым у краіне стваральнікам інтэлектуальнай уласнасці і лідарам па інавацыях. Такую думку выказаў падчас прэс-канферэнцыі з нагоды святкавання 100-годдзя беларускай навукі старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.

Беларуская вакцына ад COVID-19

— За стагоддзе свайго існавання акадэмічная навука перажывала розныя часы. Гістарычны адлік вядзецца ад стварэння сто гадоў таму ў Мінску Інстытута беларускай культуры. Самыя драматычныя перыяды — гэта гады Вялікай Айчыннай вайны, вымушаная дзейнасць беларускіх вучоных у эвакуацыі ў розных гарадах Расіі і Казахстана, і пачатак 90-х гадоў XX стагоддзя, калі пасля распаду СССР зніклі заказы па абаронай тэматыцы, спынілася фінансаванне распрацовак з саюзнага бюджэту, і вучоныя засталіся без сродкаў да існавання, — канстатаваў Уладзімір Гусакоў. — Да стагадовага юбілею ў Нацыянальнай акадэміі навук падрыхтавалі ўнікальнае выданне — сямітомнік «25 гадоў стварэнняў і здзяйсненняў».

Сёння НАН Беларусі — гэта буйная навукова-вытворчая карпарацыя, якая аб'ядноўвае больш як 110 арганізацый, з іх прыкладна 70 — навуковых. У акадэміі створана каля 150 вытворчасцяў, арыентаваных на выпуск інавацыйнай прадукцыі 5-га і 6-га тэхналагічных укладаў. Візіткай акадэміі з'яўляюцца найноўшыя распрацоўкі па шырокім спектры актуальных навукова-тэхнічных трэндаў: гэта атамная і аднаўляльная энергетыка, аэракасмічная галіна, штучны інтэлект, лічбавізацыя і рабатызацыя, беспілотны і электратранспарт, новыя кампазіцыйныя матэрыялы і многае іншае. У краіне сфарміравана канкурэнтаздольная біятэхналагічная галіна.

Літаральна з першых дзён фіксацыі пандэміі каранавіруса Акадэмія навук актыўна ўключылася ў вырашэнне гэтай праблемы. «Мы стварылі Міжведамасны савет — каардынацыйны цэнтр па выпрацоўцы аператыўных рашэнняў, накіраваных на вывучэнне каранавіруса і прыняцце аператыўных мер барацьбы з ім, укамплектавалі некалькі лабараторый сваім абсталяваннем і сёння можам ужо смела заяўляць, што ў нас у супрацоўніцтве з Міністэрствам аховы здароўя створаны прататып вакцыны, які праходзіць зараз даклінічныя выпрабаванні. Затым будуць клінічныя выпрабаванні, і да канца года, як мы плануем, ужо перададзім сваю вакцыну для выкарыстання», — паведаміў Уладзімір Гусакоў.

Старшыня Прэзідыума НАН таксама расказаў, што паралельна ў акадэміі вядуцца работы і над іншымі вакцынамі, ствараецца першы ў краіне Цэнтр вірусалогіі. «У нас створана сваё фармацэўтычнае прадпрыемства «Акадэмфарм». Мы вырабляем найноўшыя прэпараты на базе свайго сінтэзу і змаглі асвоіць выпуск лекаў, якія пастаўляліся па імпарце, у тым ліку і для лячэння каранавіруснай інфекцыі, гэта значыць, супрацьвірусныя прэпараты, якія каштавалі вельмі дорага і былі недаступныя для нашых спажыўцоў. Зараз яны на парадак таннейшыя і даступныя ўсім», — дадаў акадэмік.

Уладзімір Гусакоў адзначыў, што арганізацыі НАН выконваюць работы не толькі для патрэб унутранага рынку, але і на экспарт: «Па папярэдніх даных, у 2021 годзе экспарт арганізацый НАН склаў 50 млн долараў. І, нягледзячы на складаныя ўмовы пандэміі і санкцыі, мы не знізілі гэты паказчык, па-ранейшаму актыўна працуем са сваімі замежнымі партнёрамі і калегамі».

«Маладая акадэмія»

Як зазначыў **Галоўны вучоны сакратар НАН, старшыня Савета маладых навукоўцаў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Андрэй ІВАНЕЦ**, у Беларусі выбудавана сістэма падтрымкі таленавітай моладзі, арыентаванай на навуковыя даследаванні.

Адной з найважнейшых мер стымулявання на дзяржаўным узроўні з'яўляюцца стыпендыі Прэзідэнта для таленавітай моладзі. Па выніках мінулага года кожны трэці з адзначаных такім чынам быў прадстаўніком Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З аспірантаў кожны чацвёрты навучаецца ці працуе ў акадэміі. У НАН рэалізоўваецца буйны сістэмны праект «Маладая акадэмія», распрацоўваецца канцэпцыя маладзёжнай палітыкі ў рамках акадэміі, якая таксама будзе ўключаць шэраг мер стымулявання і падтрымкі не толькі маладых вучоных, але і навучэнцаў, студэнтаў. Актыўна праводзіцца конкурс навуковых работ «100 маладых талентаў».

Не менш важна, што маладыя вучоныя атрымліваюць сур'ёзную падтрымку ў правядзенні даследаванняў — у выглядзе грантаў Фонду фундаментальных даследаванняў. Толькі ў 2021 годзе было прафінансавана 56 маладзёжных праектаў рэспубліканскага ўзроўню і больш як 50 праектаў, якія выконваюцца сумесна з маладымі расійскімі вучонымі. Было падтрымана і каля 20 сумесных праектаў акадэмічных і вузаўскіх маладых даследчыкаў. Такім чынам толькі за кошт беларускага Фонду падтрымкі фундаментальных даследаванняў прастымулявана каля 720 маладых беларускіх вучоных.

Уклад гуманітарыяў

Сёння ў краіне адбываецца рэнесанс беларускай мовы і гуманітарыстыкі. Так лічыць **акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі акадэмік Аляксандр КАВАЛЕНЯ.**

У якасці пацвярджэння таго, што дзяржава надае вялікае значэнне захаванню беларускай мовы, культуры, гісторыі, ён прывёў той факт, што ў краіне выдадзена 37 тамоў Гістарычнага слоўніка беларускай мовы. Слоўнік максімальна поўна адлюстроўвае склад, стан і якасць беларускай лексікі XIV—XVIII стагоддзяў. У ім змешчана больш за 75 тысяч слоў, зафіксаваных у летапісах, статутах, хроніках, рыцарскіх раманах, мемуарных і публіцыстычных творах.

Нацыянальная акадэмія навук з'яўляецца вядучым цэнтрам вывучэння гуманітарных дысцыплін, тут ідзе фундаментальнае асэнсаванне культурна-моўных працэсаў, ажыццяўляецца вялікая выдавецкая дзейнасць. Толькі летась выйшлі 392 выданні, у тым ліку 113 манаграфій, 161 падручнік. Гэта трывалая аснова, на якой базіруецца вучэбна-выхаваўчы працэс у школах і ВНУ.

Акрамя таго, у Акадэміі навук выдадзены пяцітомнік Беларускай філасофскай думкі. Філосафы прапанавалі канцэптуальную мадэль развіцця беларускай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Яны паказалі асаблівасць і ўнікальнасць айчыннай інтэлектуальнай культуры ва ўзаемасувязі з заходняй і ўсходняй традыцыямі. Вучонымі-гісторыкамі падрыхтавана і апублікавана ўнікальная пяцітомная фундаментальная праца «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Практычна ўся навуковая база ў галіне гуманітарных навук у краіне — гэта распрацоўкі навуковых арганізацый і вучоных НАН Беларусі.

— Ёсць поўная падтрымка Прэзідэнта па ўсіх пытаннях, якія хвалююць вучоных у гуманітарнай сферы, — падкрэсліваў Аляксандр Каваленя. — Характэрным стаў 2021 год, які прайшоў пад дэвізам народнага адзінства. У адпаведным конкурсе, аб'яўленым НАН, удзельнічала больш за 1500 беларусаў рознага ўзросту і статусу — ад школьнікаў да пенсіянераў, мы назіралі незвычайную актыўнасць. Аналагічны конкурс, прысвечаны гістарычнай памяці беларускага народа, адбудзецца сёлета. Пры акадэмічных інстытутах пры ўдзеле масцітых вучоных акадэміі дзейнічаюць школы юных гісторыкаў, археолагаў, мовазнаўцаў, літаратараў, філосафаў...

Пры падтрымцы НАН Беларусі выдадзена каля 100 тамоў твораў класікаў беларускай літаратуры. Уладзімір Гусакоў дадаў, што **беларуская мова сёння вельмі добра сістэматызаваная і структураваная, і яе лёгка выкарыстоўваць у любой сферы навукі і дзейнасці, у тым ліку ў ІТ. Беларуская мова не адстае ад бурнага развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу.**

У Год гістарычнай памяці ў Акадэміі навук запланавана да выдання цэлая серыя манаграфій, тэматычных зборнікаў навуковых артыкулаў, навукова-папулярных кніг і зборнікаў дакументаў па рэгіянальнай гісторыі, па Першай сусветнай вайне, Рыжскім мірным дагаворы, Вялікай Айчыннай вайне, аб укладзе ў развіццё Беларусі найбольш вядомых гістарычных персон.

Чалавечы капітал

